Пролетарыі усіх краёў, аб'ядніцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вароцюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон [illegible] (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	6 р. — к.
Зьмена адрасу: Інтэрнародзія	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок пашпарэлі пасьлядо тэксту	1 р. — к.
За радок пашпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьвяшныя на 50 проц. даражэй.
Зьнак тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 152 (2340) Серада, 4-га ліпеня 1928 г.

Адзіная асноўная праграма Камінтэрну.

(З артыкулу Клары Цэткін).

Неабходнасьць і важнасьць адзінае асноўнае праграмы для ўсіх сэкцый Камунісэучнага Інтэрнацыяналу выцякае з самае сутнасьці яго. Камуністычны Інтэрнацыянал хоча ў духу Маркса і Энгельса, дзейнічаючы сьвядома, «рабіць гісторыю», як яму гісторыю «рабіць належыць». Яго задача—плянамерна аб'яднаць усе рэвалюцыйныя сілы пралетарыяту і больш таго—усіх працоўных, усе прыгнечаныя клясы і народы, арганізоўваць іх і няўхільна павышаць іх ідэязольнасьць і волю да чынпасьці. Мэта гэтага—праз максымальнае разгортваньне магутнасьці ўсіх гэтых сіл павесьці іх да зруйнаваньня сусьветнага імпэрыялізму і да ажыцьцяўленьня камунізму, як сусьветнага грамадзкага парадку. Камуністычны Інтэрнацыянал ня хоча і не павінен ісьці па шляхі гістарычных падзей; у гэтым бушуючым патоку ён сам павінен мець поўныя мэты і быць упэўненым у сваіх шляхох рухаючай сілай. Выкананьне гэтае грандыёзнае задачы патрабуе ў міжнародным маштабе адзіных кіраўнічых прынцыпаў,—згодна ленінскага палажэньня, што дай добрага руху патрабуецца добрая тэорыя,—патрабуе ахопу гэтых прынцыпаў у адзінай праграме.

Па сваіх мэтах і заданьнях праграма Камуністычнага Інтэрнацыяналу павінна адпавядаць ленінскаму лёзунгу: «Бяжай да мас». Яна павінна даць усім камуністычным партыям асноўныя ў міжнародным маштабе, аб'ядналчыя, кіраўнічыя лініі іх палітыкі і ўсяе іх дзейнасьці; яна павінна даць кіраўнічую лінію міжнароднае значнасьці для такога роду чыннасьці, якая, разгортваючыся, бяспупынна робіцца раўнамоцнай рэвалюцыйнаму абуджэньню і пасьпяваньню растучых пралетарскіх працоўных мас да барацьбы за нашу канчатковую мэту. Дасягнуць гэтага магчыма толькі ў тым выпадку, калі працоўныя масы будуць разумець і цаніць камуністычныя партыі ня толькі як надзейных правадыроў у сваёй барацьбе за прызвычаеных да ўсіх жыцьцёвых умоў, да ўсіх патрэбаў мас надзейных правадыроў у барацьбе за штодзённыя вымаганьні, але і, у першую чаргу, як перадавых байцоў і градзеньнікаў новага сьветапагляду, гышэйшага, вызваленага ад нівольніцтва і эксплёатацыі грамадзкага парадку. Імкненьне да гэтага новага, няўхільнае волі да стварэньня вышэйшага павінна стаць сьвядома дзейнічаючай сілай, якая стварае ўнутраную сувязь між паасобнымі эпізодамі штодзённае барацьбы, пасоўвае яе ад этапу да этапу наперад, па поўным шляху, надае паасобным яе эпізодам моц і значэньне, якія выходзяць за межы данага моманту.

Тым самым сьвядомасьць мас укараняе ўвесь сэнс сьветазбагачаючага, творчага пачатку зьместу камунізму, які робіцца невычарпаемай крыніцай сіл. Вось дзеля гэтае мэты і павінна служыць наша праграма па сваім зьмесьце і фармулёўцы. Яна зусім не павінна быць кампактным вучоным трактатам і сводкай нашых прынцыпаў і нашае тактыкі, прызначанае для тых таварышоў, якія, дзякуючы грунтоўнай тэарэтычнай падрыхтоўцы, разумеюць гістарычнае разьвіцьцё ў духу гістарычнага матэрыялізму. Праграма наша перш за ўсё павінна ўзброіць належным чынам усіх адказных працаўнікоў кампартый, усіх членаў, прымушаць іх да растлумачэньня і ўкараненьня ў розумы таварышоў па працы на прадпрыёмствах, у прафсаюзах і ўсюды, дзе сустракаецца з імі, пачатак ідэй камунізму як вызваленчага сьветапагляду, у процівагу ўсім іншым ідэалёгіям. Нават больш таго, наша праграма павінна несьці абуджэньне, поўныя мэты, сьвет і арганізацыю ў тыя шырокія пралетарскія масы, ва ўсе тыя клясы і сацыяльныя пласты, якія пад ярмом трэстыраванага капіталу, перад тварам распаду буржуазнае культуры ў пэрыяд імпэрыялізму прыходзяць да ўсё больш растучае супярэчнасьці, да ўяўленьня супярэчнасьцяй буржуазнага грамадзкага парадку. Наша праграма павінна стаць уласнасьцю шырокіх народных мас.

Праграма павінна быць крыніцай гістарычнага сьветаразуменьня, крыніцай сілы і сьвету, вызначаючай шлях праз усю пярэстасьць, рознастайнасьць і блытаніну штодзённых падзей і згуртоўваючай міліёны ў адзіным непарушным парыве: уперад, да рэвалюцыі.

У гэтых адносінах праэкт праграмы выпрацаваны праграмнай камісіяй Выканкому Камінтэрну, патрабуе вялікага тэарэтычнага завастраньня і запаўненьня зазначаных прабелаў. Няшчаднае выкрываньне злачынай дзейнасьці рэфармістаў II Інтэрнацыяналу, разумеецца, не павінна адсутнічаць. Яго неабходна дапоўніць і паглыбіць грунтоўным асьвятленьнем выкрываньняў усіх ашуканскіх, адурманьваючых масу тэорый рэфармізму. Трэба выкрыць да канца ня толькі ілюзію адносна дэмакратычнай рэспублікі і ўтопіі ультра рэфармізму, але і ўсю балтаню аб «ідэі дзяржаўнасьці», якой павінны падначаліцца пралетарскія клясавыя інтарэсы; байку аб «гаспадарчай дэмакратыі», гэты стары тавар з берынштэйнскага арсэналу, панова вычышчаны Гільфэрдынгам; байку аб тым, што прадпрыёмчы абсалютызм можна перамагчы і без рэвалюцыйнай клясавай барацьбы пралетарыяту, шляхам прафсаюзнай палітыкі грамадзянскага міру, сацыяльныя рэформы і ўсё іншае.

Па сваім зьмесьце і рэдакцыі наша праграма павінна быць прыкладам для нашай барацьбы за завяёвы міліёнаў працоўных мас, за выраўнаньне нашай падвойнай задачы: канчаткова вызваліць гэтыя масы з-пад уплыву рэфармісцкіх лідэраў і непарушна аб'яднаць іх з камуністычнымі партыямі ў чырвона-адзіным фронце барацьбы ня толькі за штодзённыя патрабаваньні, але і за перамогу рэвалюцыі.

Праэкт, гэта—шырокая база для камуністычнай праграмы, якая адпавядае гэтым патрабаваньням. Але ўсё-ж такі наша праграма—і гэта маё глыбокае перакананьне—пасьля дакладнай прапрацоўкі яе камісіяй кіруючых тэарэтыкаў і практыкаў павінна быць прадстаўлена на разгляд ня толькі пасьля таго, як яна падпадзе грунтоўнаму адкрытаму абгаварэньню ва ўсіх сэкцыях Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Гэта дасьць праграме самыя карысныя ідэі са ўсяго грамадзкага жыцьця і быту, невычарпальнае багацьце якога Ленін так часта падкрэсьліваў. Дыскусія ў нацыянальных сэкцыях выявіць усё, што няясна і нявыразна, і тым самым паскорыць зьнішчэньне недахопаў як у тэорыі, так і на практыцы. Яна прымусіць членаў партыі і спачуваючых масы правесьці вялікую неабходную ідэалёгічна-выхаваўчую працу. Пры супрацоўніцтве мас наша праграма зробіцца жывым увасабленьнем часткі вызваленчага руху рабочай клясы, які павінен быць справай рук самой рабочай клясы.

Кабалістыка пана Пілсудзкага.

((З перадавіцы «Правды»).

МАСКВА, 3-7. «Правда» у перадавіцы пад загалоўкам «Падарункі Пілсудзкага» піша так: «На выгляд прыгожа-тэатральны гэст у вельмі вядомым мусалінінскім стылі: падрыхтаваная перагрупоўка ў складзе ўраду і яскравае інтэрв'ю „самаго" з чарговым штурхом па адрасе так званага «народнага пралетарыяту». Аднак, у інтэрв'ю Пілсудзкага з сваім афіцыёзам ёсьць рэчы, на якіх варта спыніцца. Зазначыўшы, чаму ён у сучасны момант лічыць больш практычным пасадзіць іншага на прэм'ерскае крэсла, „маршал дадаў, што ён гатоў у крытычны момант... ізноў узяць на сябе адказнасьць і заняць пасаду прэм'ера".

Пра «крытычны момант» звычайна не гаворыць даромна; значыць крытычны момант прадбачыцца ў будучым і ня вельмі далёкім; значыць рыхтуюцца падарункі, і для іх падрыхтоўкі лічэй часова пакінуць пасаду прэм'ера. Падарункі—у якой галіне? У галіне ўнутранай палітыкі? У галіне палітыкі замежнай? Тое-сёе гаворыць за першае меркаваньне.

Аднак, мы ня ўпэўнены, што іменна меў на ўвазе Пілсудзкі, калі гаварыў у інтэрв'ю з супрацоўнікам «Гласа Правды» пра «крытычны момант». Падарункі могуць знаходзіцца і ў галіне замежнае палітыкі. Шмат фактаў сьведчыць за гэтае меркаваньне. Успомнім пра некаторыя з іх.

Містэр Лінднэй, ангельскі пасол у Бэрліне, назначаны намесьнікам міністра замежных спраў Вялікабрытаніі, наведаўся ў Варшаве перад сваім выездам у Лёндан да маршала Пілсудзкага,—факт ня звычайны ў дыпляматычным сьвеце.

Румынская вайсковая місія прыехала з Бухарэсту ў Варшаву для перамоў наконт некаторых зьмен у польска-румынскай вайсковай згодзе. Міністр замежных спраў езьдзіў у Парыж. За ім паехала туды спэцыяльная місія польскіх генэральных штабістаў, бліжэйшых даверaных асоб маршала. Другая тройка, якая складаецца з генэрала Сасноўскага, міністра ўнутраных спраў Складкоўскага і прэзыдэнта Масьціцкага, накіравалася на ўсходнія „крэсы" рэспублікі «ў аб'езд».

Ва ўхваленым соймам дзяржаўным бюджэце, і без таго досыць дэфіцытным, значна павялічаны проці ранейшых гадоў выдаткі на армію.

Што-ж з усяго гэтага выплывае? Што „крытычны момант" азначае бліжкую вайну з адным з суседаў Польшчы?—Магчыма. Магчыма нават, што Пілсудзкі, вялікі аматар чырвоных слоўцаў, сказаў пра «крытычны момант» проста так. Ня ўсе падобныя інтэрв'ю трэба лічыць вельмі сур'ёзнымі».

СПРАВА ШАХЦІНСКІХ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ.

Прамовы дзяржаўных абвінавайцаў.

Прамова пракурора Рагінскага.

МАСКВА. 2-га ліпеня на ранішнім пасяджэньне суду па шахцінскай справе дзяржаўны абвінавайца Рагінскі зазначае, што ўсе падрабязнасьці справы, а таксама канкрэтныя ўчынкі абвінавачаных устаноўлены. Але абарона затушавала агульнае значэньне працэсу, які меў справу з контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй. Вось чаму пракуратура лічыць патрэбным адказаць. У адказе Пятэцкаму-Шаніру, Плату і Камодаву (абаронцы шчарбінаўскай групы арганізацыі) Рагінскі лічыў шчарбінаўскае кіраўніцтва рудзікамі ледзь не дасьледча-паказальным вучасткам шкодніцкае дзейнасьці арганізацыі. Сушчэўскі быў арганізатарам групы. Праз яго ўвайшлі ў арганізацыю Ржанецкі, Дэтэр, Сакалоў і іншыя. Сушчэўскі атрымліваў лісты ад Дваржанчыка і перадаваў іх іншым. Сушчэўскі меў сувязь па схоме Дваржанчык—Будны—Сушчэўскі—Харкаў. Абаронцы Камодаў, Разанскі, Дабрынін, Плян і Малянтовіч ганьбілі іншых падсудных, імкнучыся абараніць сваіх абвінавачаных, кажа Рагінскі. Я думаю, што судьдзі ў дарадчым пакоі возьмуць пад увагу, што падсудныя прышлі на покліч рабочай клясы вучыць рабочую клясу, прышлі вучыцца і самі пралетарскаму ладу, пралетарскай дысцыпліне, аднак, яны не апраўдалі даверʼя, якое даў ім пралетарыят. Яны былі лёгчымі ў сваім шкодніцтве і здрадніцтве, а я лічу, што і судьдзі павінны быць лёгчыны ў суровым падходзе да падсудных.

Прамова пракурора Крыленкі.

Пасьля т. Рагінскага выступіў т. Крыленка. Абаронцы, кажа ён, прызнаючы факт існаваньня контр-рэвалюцыйнае арганізацыі, не павінны былі зьмяншаць значэньня гэтай арганізацыі, калі яны самі стаяць на варце праўды і рэвалюцыі. Між тым, ніводзін абаронца ня выявіў палітычнага боку працэсу. Ніводзін ня ўзняў пытаньня аб тым, як трэба ў такім разе адносіцца да самага факту існаваньня арганізацыі і да абавязку выявіць праўду да канца. Абвінавачаньне лічыць катэгарычна даведзеным наліччa арганізацыі. Яна ахапляла галоўныя кіраўніцтвы рудзікамі. Яна не магла існаваць адмежавана, з гэтага выплывае існаваньне цэнтру. А цэнтр быў зьвязан з заграніцаю. Гэта ўстаноўлена. Ён быў зьвязан і з Масквою. Вось в пункту гледжаньня гэтых устаноўленых фактаў і належыць распэнаваць індывідуальную ступень адказнасьці кожнага з падсудных. Арганізацыя ахапляла ўсе кіраўніцтвы рудзікамі, абкружаючы Кузьму.

Праца Кузьмы на Пастухоўцы і затапленьне капальні—другі важкі факт. Праца на Уласаўцы і пагоршаньне якасьці вугалю—трэці. Шкодніцкі Несьватаеўскі праэкт—4-ты. Кузьма разумнейшы за іншых. Кузьма павінен быў быць зьлеплен з іншага цеста, каб не пайсьці на ўдзел у шкодніцкай арганізацыі. Кузьма ня можа нічым давесьці, што інтарэсы рабочых мас і новага будаўніцтва Данбасу—гэта яго родныя, блізкія інтарэсы. Такога моманту ў жыцьці Кузьмы няма. Крыленка ня верыць, каб Кузьма адважыўся стаць на іншы шлях. Кузьма для гэтага вельмі асьцярожны чалавек. Ён думае, што будучына—цьмянасьць, а тут ён выкруціцца. Кузьма—гэта затоены вораг і трэба ўжыць усе захады, каб яго надзеі выкруціцца ня здзейсьніліся. Прамову абаронцы Оцэпа Крыленка лічыць няўдалаю. Адхіляць паказаньні Гаўрушэнкі з прычыны яго самагубства—няма падстаў, бо ён забіў сябе пасьля плачу і выгукаў: «я выдаў, я выдаў». У адносінах да Рабіновіча, кажа Крыленка, пытаньне можа быць пастаўлена толькі у адным кірунку. Проці шкодніцкаў ён ніколі не пашоў-бы. Калі нават ён ня спрыяў-бы шкодніцкам, дык ён ведаў аб гэтым і не паведаміў каго належыць. З пункту гледжаньня 58-7 арт. крымінальнага кодэксу гэтага давоі.

Гэты працэс, кажа ўрэшце Крыленка, быў цэнтрам увагі працоўных мас ня толькі нашага краю, але і краёў Захаду. Справа зараз у тым, як абыйсьціся з людзьмі, якія нам здрадзілі, падманулі, прадалі.

Нам яшчэ доўга давядзецца мець справу з выхадцамі з чужых нам клясаў. Мы возьмем да сабе на працу сумленных і сурова расправімся са здраднікамі. Суд павінен і зараз зрабіць сваю справу.

Прадстаўнікам дзяржаўнага абвінавачаньня адказвалі абаронцы Левэнбэрг, Пятэцкі-Шаніра, Плат, Разанскі, Малянтовіч, Оцэп і Камодаў.

Па вячэрнім пасяджэньні суд заслухаў апошнія словы падсудных. Да 11 гадз. вечара сказалі апошнія словы 23 падсудныя, у тым ліку 8, якіх пракуратура патрабуе расстраляць. Вялікія прамовы сказалі Беразоўскі, Братаноўскі, Казарынаў і Кржыжаноўскі. Усе яны, апроч Казарынава, прызнаюць сваю віну і просяць літасьці. Казарынаў літасьці ня просіць, лічачы, што ён заслужыў цяжкае кары. Ён, аднак, упэўнен ў аб'ектыўнасьці суду і з нецярплівасьцю чакае прысуду. Рэшта падсудных просяць вымякчыць іх удзел, а некаторыя—апраўдаць.

РАБОЧЫЯ ПАТРАБУЮЦЬ СУРОВАЕ КАРЫ ЗДРАДНІКАМ.

Францускія камунальнікі проці шахцінскіх здраднікаў.

МАСКВА, 2-7. ЦК саюзу камунальнікаў атрымаў з Парыжу ад выканкому саюзу камунальнікаў тэлеграму, у якой зазначана: «Суд, што судзіць данскіх сабатажнікаў, пакуленых міжнароднай контр-рэвалюцыяй, павінен быць зьвяхітасным у адносінах да іх. Трэба тых, хто зьяўляецца толькі адным са зьвеньняў ланцугу, які імкнецца прыказаць Расею ізноў да капіталістаў, пакараць з вялікаю суровасьцю».

Украінскія мэталёўцы проці шахцінскіх здраднікаў.

ХАРКАЎ, 2-7. Усеукраінская вытворчая канфэрэнцыя мэталёўцаў зьвярнулася да Вярхоўнага суду СССР з такою тэлеграмаю: «Усеукраінская вытворчая канфэрэнцыя мэталёўцаў ганьбіць учынкі шахцінскіх шкоднікаў, якія перашкаджалі справе сацыялістычнага будаўніцтва. Канфэрэнцыя патрабуе пакараць усіх шкоднікаў суровымі мерамі рэвалюцыйнай абароны». З такою-ж тэлеграмаю канфэрэнцыя зьвярнулася да Вярхоўнага суду УССР у зьвязку з распачатым працэсам шкодніку з будаўнічага бюро Данбугалю.

„Безапаснае русло" ангельскіх прафэдраднікаў.

ЛЁНДАН, 2-VII. Выканком незалежнае рабочае партыі, абмеркаваўшы «становішча, якое стварылася ў зьвязку з агалошаньнем адозвы да рабочых Англіі, падпісанай старшынёю незалежнае рабочае партыі Мэкстонам і Кукам, выказаў салідарнасьць «з духам і мэтаю» адозвы. Выказваючы здаволеньне, што адозва зусім ня мае на мэце раскалоць рабочы рух, выканком большасьцю галасоў ухваліў зьвярнуцца да мясцовых арганізацый рабочае партыі і да ўсіх сяброў партыі з заклікам узяць удзел у гэтай спробе зазабясьпечыць „моцную сацыяльную праграму". Палітычныя колы лічаць, што гэтая пастанова вельмі характэрна для тактыкі лідэраў незалежнае рабочае партыі і выражае наперад лёс узьнятай Кукам і Мэкстонам кампаніі. З пастановы можна думаць, што вынікі гэтае кампаніі будуць нікчэмнымі. Лідэры незалежнае рабочае партыі, як відаць, хочуць узяць кампанію ў свае рукі, каб неравесьці яе у «безапаснае русло».

Міжнародны кангрэс харчавікоў.

ПОСЬПЕХ САВЕЦКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ НА КАНГРЭСЕ.

ВЕНА, 2-VII. Адчыніўся 4-ты міжнародны кангрэс харчавікоў. На кангрэсе прысутнічае тры савецкіх дэлегаты. З прывітаньнем выступіў—Отто Бауэр—ад імя аўстрыйскае сацыялдэмакрытычнае партыі і інш. Савецкі дэлегат Вэйнбэрг прапанаваў далучыць да парадку дню пытаньне наконт ваеннай небясьпекі.

Абасноўваючы сваю прапанову, т. Вэйнбэрг зазначыў,—абавязкам кожнага рабочага кангрэсу зьяўляецца абмеркаваць пытаньне аб вайне, з прычыны таго, што ваенныя падрыхтоўкі, накіраваныя, пераважна, проці СССР, блізупінна вядуцца ўсімі імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Сэкратар выканаўчага камітэту Інтэрнацыяналу харчавікоў выказаўся за адхіленьне прапановы савецкае дэлегацыі, заявіўшы, што Амстэрдамскі Інтэрнацыянал хутка абмяркуе пытаньне наконт ваеннай небясьпекі разам з 2-м Інтэрнацыяналам. Прапанова савецкае дэлегацыі адхілена большасьцю проці 16-ці галасоў. Большасьцю ўсіх галасоў проці 16-ці кангрэс адхіліў таксама прапанову савецкай дэлегацыі далучыць да парадку дню пытаньне аб палітыцы Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу.

Абасноўваючы сваю прапанову, савецкая дэлегацыя зазначыла, што Амстэрдамскі Інтэрнацыянал затушоўвае абвостраньне клясавых супярэчнасьцяў і ваенныя падрыхтоўкі міжнароднай буржуазеі і замест мабілізацыі рабочых мас дамагаецца іх дэмабілізацыі. Адхілена таксама патрабаваньне савецкай дэлегацыі ўключыць яе прадстаўніка ў прэзыдыум кангрэсу. Матывуючы гэтую прапанову, савецкая дэлегацыя падкрэсьліла, што яна зьяўляецца прадстаўніком 460-ці тысяч рабочых харчавікоў, або 70 проц. агульнага ліку сяброў Інтэрнацыяналу і мае 15 галасоў на кангрэсе. Большасьцю ўсіх галасоў проці 15-ці адхілена і прапанова савецкай дэлегацыі далучыць да Інтэрнацыянала прафесыянальныя саюзы харчавікоў Францыі і балканскіх краёў, якія стаяць на грунце клясавай барацьбы і не ўваходзяць у Амстэрдамскі Інтэрнацыянал.

Пасьля галасаваньня савецкая дэлегацыя выступіла з заявай, у якой падкрэсьліла, што такая пастанова вядзе да далейшага расколу адзінства прафесыянальнага руху. Савецкія дэлегаты Вэйнбэрг і Урсіні выступілі на масавым мітынгу, наладжаным для кангрэсу. Савецкія дэлегаты апавядалі рабочым пра сацыялістычнае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе і адзначылі пытаньне аб ваеннай небясьпецы. Выступленьні савецкіх дэлегатаў былі спатканы бурнай авацыяй удзельнікаў мітынгу.

Забастоўка пратэсту.

ПАРЫЖ, 2-7. У зьвязку з абвалам у капальні Рош ля-Мольер, выкананым унітарнае канфэдэрацыі прафсаюзаў горнарабочых паслаў сваіх дэлегатаў, каб расьсьледваць прычыны катастрофы. Адначасна выканком ухваліў рэвалюцыю, у якой заняўляе пратест проці дрэнных мер аховы працы ў горнапрамысловых прадпрыёмствах і патрабуе ўважліва вывяіць прычыны катастрофы і асоб, адказных за яе.

На карысьць ахвяр катастрофы выканком даў 2 тысячы франкаў, а ЦК кампартыі—3.000 франкаў. Вугляковы басэйну Луары абвясьцілі 24-хгадзінную забастоўку пратэсту проці дрэнных мер аховы працы. Камфракцыя палаты дэпутатаў хоча падаць запытаньне ўраду наконт катастрофы і адказнасьці за яе. «Юманітэ» падкрэсьлівае, што капальня, дзе здарылася катастрофа, даўно лічылася «пад пагрозаю».

Тыдзень расейскай гісторыі.

БЭРЛІН, 2-7. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Нямецкае таварыства вывучэньня ўсходняе Эўропы наладжвае з 7-га да 14-га ліпеня ў прускай акадэміі навук «тыдзень расейскай гісторыі» і выстаўку, дзе будзе паказана разьвіцьцё савецкага права з 1917 да 1927 г. З дакладамі будуць выступаць выдатныя расейскія, украінскія і беларускія гісторыкі на чале з Пакроўскім».

АНГЕЛЬСКІЯ РАЗЬВЕДЧЫКІ.

РЫГА, 30-6. Вышлі з Рыгі ангельскія крэйсэры. Орган лёвых прафсаюзаў «Зініяс Лайкмэтс» наконт гастроляў ангельскай эскадры піша: «Гэта дэманстрацыя проці СССР. Больш таго, калі ангельскі флёт заходзіць сюды ня звычайна ў госьці, а робіць маневры і вывучае Балтыцкае мора, дык гэта значыць, што ангельцы хочуць прыстасавацца да магчымасьці весьці вайну іменна ў райёне Балтыцкага мора. Мы вітаем матросаў-рабочых ангельскага флёту і пераконаны, што яны, у выпадку вайны, здолеюць накіраваць гарматы куды належыць».

ОБРЭГОН—ПРЭЗЫДЭНТ МЭКСІКІ.

МЭКСІКА, 2-7 На прэзыдэнцкіх выбарах у Мэксіцы 1-га чэрвеня прэзыдэнтам рэспублікі абран генэрал Обрэгон. Абраньне яго было забясьпечана загадзя, бо ён зьяўляўся адзіным кандыдатам. Як у кангрэсе (агульна-мэксіканскі парлямант), так і ў законадаўчых зборах асобных штатаў Обрэгон карыстаецца падтрыманьнем большасьці.

УВАГА: генэрал Альварон Обрэгон паходзіць з фэрмераў, ён жывёлавод. У 1914 і 1915 г. г. ён быў адным з правадыроў паўстаньня проці ўраду рэакцыйнага прэзыдэнта Дэ-ля-Хуэрта, прадстаўніка буйных земляўласьнікаў. У 1920 годзе Обрэгон быў абраны прэзыдэнтам і заставаўся на гэтай пасадзе да 1924 г. На пасадзе прэзыдэнта Обрэгон распачаў праводзіць зямельную рэформу, абяцаную ў 1917 г., але яна праводзілася нерашуча і непоўнасьцю. Кандыдатура Обрэгона на сучасных выбарах падтрымлівалася рэфармісцкай мэксіканскай канфэдэрацыяй працы.

АМАНУЛА ВЯРНУЎСЯ НА БАЦЬКАЎШЧЫНУ.

КАБУЛ, 1-VII. У Кабул прыехаў падышах Аманула, які вярнуўся з 7-міхесячнага заграніччнага падарожжа. З прычыны прыезду падышаха абвешчана сьвята на 3 дні. Горад багата прыбраны.

Перагляд неразабраных угавораў.

ШАНХАЙ, 2-7. Друк паведамляе, што міністэрства замежных спраў запрашае на 20 ліпеня ў Нанкін прадстаўнікоў чужаземных дзяржаў, каб абмеркаваць пытаньне аб перагляде неразабраных угавораў.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Чарговы ўзнос бастуючым Швэдыі.

МАСКВА, 2-VII. ЦК саюзу горнарабочых перавёў у Швэцыю на дапамогу бастуючым гарняком чарговы ўзнос у 16 тысяч рублёў. Разам за час забастоўкі пераведзена 392 тысячы рублёў адначасна ЦК саюзу гарнякоў паслаў швэдзкаму саюзу ліст, у якім, між іншым, зазначна: «Мы думаем, што трэба было-б адгукнуцца на пастановы апошняга кангрэсу горнарабочых, які фактычна зачыніў назаўсёды дзьверы перад нашым саюзам, ухваліўшы, што толькі арганізацыі, якія прызнаюць мэты Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу, могуць знаходзіцца ў яе складзе. Што датычыць дапамогі, дык наш саюз і ў далейшым будзе дакладна выконваць усклаўзеныя на сябе абавязкі. Мы спадзяёмся, што адзінства швэдзкіх і савецкіх гарнякоў дасьць перамогу стойкім рудакопам Швэдыі».

Выпуск новых камандзіраў.

МАСКВА, 2-7. 2-га ліпеня ў вялікім крамлёўскім палацы адбыўся ўрачысты выпуск слухачоў Вайсковай Акадэміі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі імя Фрунзэ. Камандзіраў-выпускнікоў віталі старшыня ЦВК СССР Калінін, намесьнік старшыні Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР Уншліхт, сябры Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР Посьнікаў, Баранаў і начальнік штабу Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі Шапашнікаў.

6-цігадзінны рабочы дзень.

СТАЛІН, 2-VII. Сёньня капальня № 9 Шчаглоўскага рудніка перайшла на 6-цігадзінны рабочы дзень. На капальні працуе 200 рабочых. Праца будзе праводзіцца ў 3 зьмены па 6 гадзін. Рэшта 6 гадзін будуць выкарыстаны так: 4 гадзіны для падрыхтоўчае працы і 2 гадзіны патраціцца на зьмены рабочых.

НОВАЯ ПШАНІЦА.

КІЗЫЛ-АРДА. На рынках паўдзённага Казакстану зьявілася пшаніца новага ўраджаю.

Саранча.

РАСТОЎ-ДОН. У Шахцінскай акрузе зьявілася саранча на плошчы блізка тысячы гэктараў. На барацьбу з ёю выслан атрад.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

«ПОЛЬСКА ДО ТАБОЛЬСКА».

У Варшаве адбываецца цапер зьезд палякаў—б. вайсковых сібірскіх карпусоў. Як і ўсё цапер у Польшчы, зьезд праходзіць пад знакам настрою пысудчыкаў, замеры якіх сягаюць вельмі далёка і спыняюцца, як гэта асабліва відаць з віленскіх польскіх газэт, на так званых „шляхох Батотага", які ў свой час заваяваў наш Полацак.

ПРЫСУД НАД Р. АСТРОЎСКІМ.

Апраўданы па працэсу „Грамады" б. дырэктар віленскай беларускай гімназіі Радаслаў Астроўскі прысуджан гэтымі днямі за супроціў і абразу польскай адміністрацыі, адабраўшай ад бел. гімназіі патрэбныя ёй памяшканьні, на два месяцы вастрогу.

НЕСПАДЗЯВАНЫ АРЫШТ ЛІТ. ПАЛІТЭМІГРАНТА КЕДЫСЯ.

«Кур'ер Віл.» (№ 146) паведамляе, што б. пасол 3-гасойму літоўскай рэспублікі п. Кедысь выехаў гэтымі днямі з Вільні да знаёмых у Сьвяцянцы, дзе быў неспадзявана захоплен якімісьці таямнічымі асобамі і выпраджан за межы ў Літву.

Забастоўка шаўцоў у Вільні.

Гэтымі днямі выбухла забастоўка шаўцоў. Забастоўшчыкі жадаюць павышэньня платы на 50 проц.

Пажар м. Лужак.

Гэтымі днямі ў м. Лужках здарыўся вялікі пажар. Згарэла некалькі дзесяткаў дамоў.

ПРАФ. ГАРБАЧЭЎСКІ СТАРАЕЦЦА

Вядомы прапагандыст польска-літоўскага збліжэньня праф. ковенскага універсытэту Гэрбачэўскі вымешчыў у польскіх газэтах пісьмо да польскага грамадзянства з падзякай за прыём, які яму аказалі ў Польшчы з заклікам да „далейшай працы пад збліжэньнем двух дзяржаўных нацый".

Пасол Польшчы пры рымскім папе.

Б. шэф дыпляматычнага пратаколу п. С. Пшэзьдзецкі назначаецца на пасаду польскага посла пры Квірынале.

Польска-літоўскія перамовы.

КОЎНЯ, 2-7. Літоўскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што на другім пасяджэньні польска-літоўскае камісіі па пытаньнях аб безапаснасьці і ўзаемных дамаганьнях выплаты са страты павінны былі абмяркоўвацца абодвы пытаньні. Па першым пытаньні старшыня польскае дэлегацыі заявіў, што да гэтага часу дэлегацыя ня мае яшчэ інструкцый ад новага польскага габінэту; каб паскорыць атрыманьне інструкцый, у Варшаву выехаў сябра дэлегацыі, прафэсар Макоўскі. Па другім пытаньні старшыня польскае дэлегацыі заявіў, што дэлегацыя ня можа абмяркоўваць пытаньня аб стратах ад захопу Віленшчыны генэралам Жэлігоўскім асобна ад іншых пытаньняў аб стратах. Літоўская дэлегацыя заявіла ў адказ аб сваёй гатоўнасьці абмеркаваць усе пытаньні аб стратах разам пасьля таго, як будзе дасягнута згода па пытаньні аб безапаснасьці, бо «тады надыйдзе час упарадкаваць усе разьлікі».

Адказ Літвы на апошнюю ноту Польшчы.

Газэта «Слово» (№ 147) паведамляе, што літоўскі ўрад ужо апрацаваў адказ на апошнюю польскую ноту ў справе ўпісаньня да новай літоўскай канстытуцыі Вільні, як сталіцы Літвы. Нота ў хуткім часе будзе ўручана польскаму ўраду.

Вага Пілсудзкага ва ўрадзе.

БЭРЛІН, 29-6. Афіцыёзная газэта „Дыплёматыш Палітышэ Карэспандэнт" наконт зьмены польскага габінэту піша так; „Пілсудзкі, які адмовіўся ад пасады прэм'ера, але захаваў за сабою партфэль міністра, застаецца, як і раней, моцнаю фігураю ў польскім габінэце і актыўным палітычным дзеячом якога ніхто ў Польшчы не заменіць. Усе-ж іншыя міністры—прыхільнікі Пілсудзкага. У зьвязку з гэтым нельга чакаць, каб урад Бартэля ўхіліўся ад курсу ранейшага габінэту"

НА ДАПАМОГУ НОБІЛЕ.

„Красін" і Нобіле.

МАСКВА. Першага ліпеня, калі «Красін» праходзіў паўз Біргабэй, ён атрымаў радыё ад Нобіле, які дзівіцца, чаму «Красін» не зайшоў да яго на параду. Самайловіч адказаў, што ня можа траціць часу і мае загад ісьці проста. Праз 2 гадзіны ізноў было прыслана радыё ад Нобіле, які выказаў жаданьне паведацца на „Красіні", каб даць інструкцыі. Самайловіч прасіў „Чата ды Мілена" падысьці да борту лёдакола, але гэтага нельга было зрабіць. «Красін» пашоў наперад і праз увесь час трымаў прыязьдзкую радыё-сувязь з Нобіле. Параход «Браганца» відаць быў з «Красіна» на паўдзённы ўсход.

Паведамленьне «Малыгіна».

ЛЁДАКОЛ «МАЛЫГІН». Раніцою 2-га ліпеня вецер значна павялічыўся. Лёдхутка рухаецца. «Малыгіна» шпарка нясе на выспу Надзеі.

Вестак ад Бабушкіна няма трэці дзень. Віза лічыць, што нічога пагражаючага ў становішчы самалёту пакуль што няма. Правізіі на аэраплане засталося да 6-га ліпеня.

Амундсэн загінуў.

ЛЁНДАН, 3-VII. З Парыжу перадаюць, што, згодна паведамленьня з Осло, цела

Конкурс на лепшы ўраджай.

Для ўздыму ўраджайнасьці зернавых і тэхнічных культур рэдакцыі «Крестьянской газеты» і «Бедноты» пры ўдзеле НКЗ саюзных рэспублік і сельска-гаспадарчае каапэрацыі арганізуюць у гэтым годзе першы ўсесаюзны конкурс на лепшы ўраджай.

Бясспрэчным зьяўляецца вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне праблемы падвышэньня ўраджайнасьці. Павялічэньне ўраджайнасьці і таварнасьці зьяўляюцца адной з асноўных праблем на шляху рэарганізацыі сельскае гаспадаркі. Толькі на гэтай аснове будзе ўзмацняцца індустрыялізацыя краіны і паляпшацца дабрабыт сялянства.

Праглядаючы ўраджайнасьць мінулых гадоў, прыходзіцца сьцьвердзіць, што, ня гледзячы на значныя штогоднія ўклады ў сельскую гаспадарку, мы на ўраджайнасьці большасьці культур яшчэ не дасягнулі нават ураджайнасьці 1911-15 г. (па жыту 85,9 проц., аўсу—74,1 проц., ячменю 88 проц. і ледзь па бульбе 116 проц. у 1927 г.). Разам з нізкай ураджайнасьцю падкрэсьліваюцца значныя хістаньні ў сярэдніх ураджаях паасобных гадох, што ня ў меншай меры небясьпечна, як і нізкі ўраджай.

У нас у БССР ня толькі ў савецкіх, калектыўных, але і ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках можна знайсьці ня толькі падвойныя, але і больш менш устойлівыя ўраджаі. Сярод апошніх з кожным годам павялічваецца лік сераднякіх гаспадарак, вьязаўшых свой лёс з дасьледчай працай, зьяўляючыся піянэрамі-спажыўцамі сталых вынікаў дасьледчых установаў з больш высокай тэхнікай, што асабліва паказальна для бедняка, сераднякіх і індывідуальных гаспадарак.

Ідэя сталага азнаямленьня в лепшай ураджайнасьцю—дэтальнага высьвятленьня шляхоў заваёў яе—і праз конкурс шырокае масавае, у адпаведнасьці з гісторыка-эканамічнымі раёнамі, скарыстоўваньне дасьля ўздыму ўраджайнасьці ўсіх сялянскіх і калектыўных гаспадарак ёсьць **найвялікшая і найадказьнейшая ідэя нанашага часу.**

Патрэбныя сродкі дзеля прэміраваньня павінны быць знойдзены. Масавы паход за больш высокай ураджайнасьцю—асноўная задача курсу. Праз друк у шмат мілёнах экземплярах у самыя глухія куткі вёскі, ва ўсе гаспадаркі павінны быць прасунуты вынікі ўпартае гэраічнае, карыснае барацьбы піянэраў культурнага земляробства за новы ўраджай. Гэтым у сёлетнім годзе пачынаецца падрыхтоўка да сьвята «Дзень Ураджаю». Вакол конкурсу на лепшы ўраджай у самым хуткім часе павінна быць згуртавана ўвага ўсяе савецкае грамадзкасьці—шырокіх колаў спэцыялістаў сельскае гаспадаркі, дасьледчых каапэрацыйных установаў, настаўніцтва, камсамолу, дабрахвотных таварыстваў.

Вялізарная роля ў поўным, правільным, зразумелым для шырокіх сялянскіх мас і калектывістаў, асьвятленьні задач конкурсу павінны адыграць спэцыялісты сельскай гаспадаркі. Секцыі спэцыялістаў, нарады іх РВК, земельныя органы, сельсаветы ў самы бліжэйшы час павінны прапрацаваць гэтае пытаньне—азнаёміць насельніцтва з парадкам і ўмовай конкурсу. Да гэтага часу ў гэтым напрамку ня зроблена ніводнага кроку. Лёзунгам «сёньня» павінна быць—увага першаму ўсесаюзнаму конкурсу—масаваму паходу за лепшы ўраджай.

Т. Аўчыньнікаў.

Хібы ў сацыяльным страхаваньні.

(Па матар'ялах Дзяржфінкантролю).

На Беларусі некаторыя страхавыя касы зьяўляюцца дэфіцытнымі. Пры рэвізіі апэрацыйнай дзейнасьці страхкасы і паступовага вывучэньня заканадаўства—галоўная задача Дзяржфінкантролю дасканальна вывучыць і ўстанавіць сапраўдныя прычыны гэтага дэфіцыту.

Галоўная прычына, якая адбіваецца на дэфіцытнасьці касы—гэта ўкрывальства страхавацелямі сапраўднай заработнай платы, з якой належыць плаціць страхузносы. З 1-га кастрычніка па май месяц на скрытую зарплату налічана страхузносаў 20.998 рублёў, праверыўшы толькі 3 проц. страхавацеляў, а колькі было-б налічана страхузносаў за скрытую зарплату страхавацелямі, калі-б праверыць яшчэ 97 проц. астатніх?

Ня можа не адбіцца на становішчы бюджэту і несвалачасовая плата страхавацелямі страхузносаў. Запазычанасьць на 1-Ѵ-28 г. лічыцца ў суме 61.557 р. і цягнецца на працягу 7-мі месяцаў.

З укрывацельствам зарплаты страхавацелямі трэба павесьці рашучую барацьбу. Запазычанасьць па страхузносах не павінна мець месьца. Страхузносы павінны плаціцца своячасова, аб чым былі пастановы ўраду.

Вось галоўная прычына дэфіцытнасьці страхавых кас, ня кажучы аб дробных прычынах, якія таксама маюць месца.

Неабходна спыніцца і на арганізацыйных выдатках страхкасы. Кантарыс зацьверджан толькі на шостым месяцы бюджэтнага году, што непасрэдна адбілася на звычайным жыцьці камітэту, а таксама зроблена на некаторых галінах перавыдаткі. Маюць месца факты безгаспадарчых выдаткаў: як арэнда памяшканьня, у выніку чаго камітэтам пераплачана за арэнду памяшканьня звыш 3000 руб.

Да скарачэньня райённай страхавой сеткі меры ня прымаліся, у той час як у гэтай галіне можна мець вынікі. Лічбы наліччa застрахаваных і страхавацеляў яскрава сьведчаць аб недастатковай нагрузцы райённых упаўнаважаных. Для скарачэньня райённай страхавой сеткі неабходна правесьці ўзбуйненьне райёнаў па абслугоўваньні застрахаваных, незалежна ад адміністрацыйнага падзелу акругі. Пытаньне гэта высунута РСІ яшчэ ў 1927 г. і яго трэба правесьці ў жыцьцё.

У абслугоўваньні застрахаваных мэдапамогай таксама ёсьць недарэчасьці і гэта недарэчасьць непасрэдна адбіваецца на бюджэце касы, напрыклад, хворы вэнэрык атрымлівае аслабаненьне звыш 5 тыдняў і карыстаецца амбуляторным лячэньнем, бо стацыянара пры вэндыспансэры ня маецца. Хворыя вэнэрыкі, прыяжджаючы з райёну, жывуць на прыватных кватэрах, якія аплачвае Акрздраў. Ня прыходзіцца сумнявацца, што пры стацыянары 5-цітыдневы тэрмін скараціўся-б і каса не аплачвала-б 5-цітыдневага аслабаненьня. Акрздраў-бы не наймаў прыватных кватэр для вэнэрыкаў і вэнэрыкі былі-б ізаляваны.

Маюцца выпадкі, калі застрахаваныя атрымліваюць часовы падсобак менш, чым ён атрымліваў ва ўстанове, калі быў здароў, а ў другіх выпадках застрахаваны атрымлівае больш. Разрахункі такія юрыдычна лічацца законнымі згодна пастановы Саюзнага Савету Сацыяльнага Страхаваньня за № 121, а па сутнасьці выклікае незадавальненьне застрахаванага, калі ён атрымлівае дапамогу менш, чым ва ўстанове і ў другім выпадку страхкаса павялічвае зарплату застрахаванага, якое становішча адбіваецца і на дэфіцытнасьці страхкасы.

Другі выпадак няжыцьцёвай пастановы—гэта калі пры хаўтурах страхкаса не дае аслабаненьня застрахаванаму і рабочы за нявольны прагул плаціцца сваёй кішэняй.

Ю. Чайка.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

За невыкананьне правіл аб найме рабочай сілы—да судовай адказнасьці.

МАГІЛЕЎ. Гэтымі днямі камітэт акруговай біржы працы заслухаў даклад аб выніках абсьледваньня парадку найму рабочай сілы будаўнічымі арганізацыямі „Расмоздор" і кіраўніцтвам на пабудоўцы шашы Магілеў—Менск, а таксама—псыхалячэбніцай і вопытнай станцыяй лекавых расьлін.

Наглецца парушэньне палажэньня аб парадку найму рабочых.

«Расмоздор» браў заможных сялян, якія маюць па 20 дзесяцін зямлі і больш 6-ці кароў (гэта большасьць датычыцца 3-ай дыстанцыі) у той час, калі батракі і наогул беднота вясковыя—хадзіла без работы.

Гэтыя-ж выпадкі назіраліся і на першай дыстанцыі кіраўніцтва па пабудове шашы.

На пабудове маста праз раку Сож працуюць кавалі саматужнікі, а накіраваныя біржай працы сябры прафсаюзу мэталістаў ня былі прыняты на працу.

Абышоўшы біржу працы, прынялі на работу каля 25 цесляроў і кровельшчыкаў—вопытная станцыя і псыхалячэбніца.

Камітэт біржы працы, бачачы такія знажэньні ў найме рабочай сілы—прапанаваў адміністрацыі «Расмоздору» заможных сялян, прынятых на працу на 3 дыстанцыі, на працягу 2-хтыднёвага тэрміну зьняць з працы, паотаўшы пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці сельскіх камітэтаў узаемадапамогі, выдаўшых куланам пасьведчаньні аб беднасьці.

Даручана апарату біржы працы рашуча змагацца супроць такіх зьявішчаў, выяўляючы кожны выпадак і прыцягваючы вінаватых праз РСІ і судовыя органы да адказнасьці.

Справу аб вопытнай станцыі лекавых расьлін прапанавана перадаць у суд.

Пастаноўлена таксама зьвярнуць увагу кіраўнікоў устаноў на тое, каб уся рабочая сіла, не залежачы ад таго, на які час яна прымаецца, праходзіла выключна праз біржу працы.

А. Ласны.

Безгаспадарчасьць.

Пухавічы. Яшчэ ў 1926 годзе былым Шацкім райвыканкомам было вызначана пабудаваць у Сяргеевічах агульную лазьню, для чаго Чырвоным Крыжам былі адпушчаны сродкі ў суме 150 руб. Але і да гэтага часу лазьня не пабудавана, хаця бярвеньні ўзімку гэтага году вывезены і гніюць зваленымі ў кучу, і мусіць яшчэ доўга будуць ляжаць, пакуль вусім не пагніюць, бо нават яшчэ не ачышчаны ад кары, ці з працягам часу будуць расьцягнуты на апал і іншыя патрэбы.

Адбудоўваючы масты, трэба ведаць характар рэчак.

У 1926 годзе дарожным атрадам былым Барысаўскай акругі былі пабудаваны масты абапал в. Грыневічы Крайскага сельсавету, Плешчаніцкага райёну.

Шмат гадоў сяляне цярпелі ад выпадковых «разгулаў» гэтай вусім нязначнай рэчкі, у летні час у некаторых мясцох нават перасыхаючай, але справіцца з ёю не маглі, ня было сіл і сродкаў.

І калі дарожны атрад прыступіў да пабудовы мастоў, то як ні высьвятлялі сяляне якасьці і характару гэтай рэчкі, як ні даказвалі, што трэба даць шырэйшы праход вадзе, інакш утварыцца аграмадны натоўп вады і грэбля будзець размыта,—не паслухаў іх галоўны дарожны майстра...

Невялікім напорам вады грэблі, на якія былі затрачаны вялікія сродкі, аказаліся размытымі.

Гэткае здарэньне маецца і ў другіх мясцох, як у в. Нушчанцы гэтага-ж раёну.

Практыка паказвае, што адбудоўваючы масты на такіх нязначных рэчках, неабходна даведацца ў сялян пра характар гэткіх рэчак, у адваротным-жа выпадку толькі дарэмна будуць зроблены страты.

Т-ро.

Гастролі Бел. Дзярж. Вандроўнага тэатру.

Полацак, 3-VII. Тэатр абслужыў м. Расоны і наведаў зноў Полацак. Тут быў наладжан адвітальны вечар, на якім прафарганізацыі выказывалі артыстам падзяку за культурную працу на Полаччыне.

Зараз тэатр накіраваўся ў м. Ветрына, адкуль пасьля 4-х пастановак наведае м. Вушачу і Вуллу, а затым вяртаецца ў Менск на адпачынак.

Эксплёатацыя.

Сьмілавічы. Летась Рудзенскі жалязком зрабіў дравяны пераклад каля вёскі Барбарова і выплачваў сялянам за возку за адлегласьць 20 вёрст, што лічылася правільным.

У бягучым годзе жалязком зрабіў пераклад на хутары Кавалевічы, далей на 4 вярсты, а выплачвае ўсёроўна за 20 вёрст.

Адзін селянін кажа:

— Я патраціў на заработкі з канём 75 дзён і мне лічылі кожны раз па 20 вёрст да Рудзенску, а на справе, калі я цяпер агледзеўся, дык дарма праезьдзіў за 75 дзён 300 вёрст. Хто мне заплаціць за гэтыя вёрсты?

Вельмі пажадана, каб на гэтую недарэчнасьць зьвярнулі ўвагу каму належыць і далі тлумачэньне.

І. Д.

Растратчык гуляе на волі.

Барысаў. Былы старшыня заводскага камітэту заводу „Леніна" Юхневіч, забраўшы ў кішэню 1000 руб., паехаў у Менск на гастролі. Вядома, якія бываюць гастролі. Пап'янствавай трохку, пагуляў з жанчынамі, а ў выніку захварэў вэнэрычнай хваробай. Праляжаўшы ў больніцы каля м-ца, зьявіўся ў Барысаў з пустымі кішэнямі. Вядома, быў суд, але Юхневіч нешта ходзіць па вуліцы, расьпяваючы. Апрача таго, за сродкі культфонду пабудаваў на сваей кватэры радыё. Узяўшы ў рассрочку ў магазыне камбіната радыё, коштам у 900 руб., да гэтага часу не зварочвае грошай. Але дзе ён гэтыя грошы возьме, калі ён заставіў іх у Менску.

Цікава, як на гэта глядзяць вышэйшыя ўстановы. Юхневіч павінен быць пакараны.

А. Жала.

ПА ВУЧОТУ.

Пачатак вучоту аб'ектаў ападаткаваньня на 1928-29 год.

Усе нашы райённыя «фінансісты» заварушыліся. Патрэбна была падрыхтоўка і яна праведзена. Скліканы былі курсы старшынь сельсаветаў, сэкратароў і старшынь камітэтаў узаемадапамогі. Прапрацаваны новы закон. Райвыканком для кіраваньня і дапамогі сельскім вучотным камісіям вылучыў упаўнаважаных.

* * *

Сёмуха. Пачатак вучоту ў вёсцы Лагаза. Ідзём туды. Дарога в Лагойску—8 вёрст. Сёньня, пасьля трохтыднёвага дажджу, першы прыгожы дзень. Усё, здаецца, аджыло і весяліцца, а асабліва жыта. Яно ўжо стала каласіцца. У лагойцаў яно цёмнае, густое, можна чакаць хлеба. Зусім другое ў савгасе Лагаза. Як вокам акінуць палетак—дзе-ні-дзе па каліву, рэдкае, нікчэмнае, з вясны падае голас савгасу, што будзеш бяз хлеба. Затое канюшына—як лес.

Вось і вёска. Звычайная як і ўсе ў нас вёскі. Адно, што крыху адрозьнівае ад іншых вёсак,—гэта гразь. Калі ў суседніх вёсках вуліцай трудна праехаць і прайсьці, дык хоць каля плоту, а можна, дык у Лагазу з ня прывязанымі да нагі ботамі (калі слабка трымаюцца) не пападайся—заставіш у гразі.

— Як вы тут ходзіце,—пытаюся ў седзячых на прызьбе дзядзькоў.

— Босыя,—адказваюць.

Мімаходам кідаецца ў вочы нешта новае, чаго раней ня было. З усёй вёскі, а вёска хат 50, толькі ў 2-х дварох пастаўлены «май»—па некалькі бярозак. У астатніх няма. Гэтым ужо лагазінцы даказваюць, што яны зразумелі непатрэбнасьць «мая», не патрэбнасьць глумленьня тысяч маладых дрэўцаў-бярозак.

Сходка. Уважліва выслухоўваюць даклад аб с.-гасп. падатку і зьменах у ім.

— Усё добра,—кажа адзін дзядзька,—дрэнна толькі тое, што трэба за рубель, які даецца зарабіць з вялікай цяжкасьцю, плаціць 25 кап. Вось тут улада зусім нядобра робіць.

Прадстаўнік РВК растлумачвае, што 25 кап. з рубля не бярэцца, а толькі вучытваецца з рубля 25 кап. у даход і вылічвае, што зарабіўшаму 100 руб. прыдзецца плаціць два руб., сераднику—3-4.

— Калі так, дык нічога страшнага,—згаджаецца дзядзька.

Пачынаецца вучот. Падыходзіць бядняк.

— Запісаў усё,—кажа,—а цяпер пагляджу як запіша другі і калі паспрабуе схаваць—першы скажу.

Так ідзе вучот. Кожны адзін за другім пільнуе.

— Правільна, кажуць, трэба запісваць.

— Колькі ў вас зямлі,—пытаюць у высокага дзядзькі.

— Было 18, а як падзяліліся з братам і бацькам стала па 6.

— Калі вы дзяліліся?

Дзядзька блытаецца. Выяўляецца, што гэта заможнік Прачкоўскі, пазычаючы цяпер шмат жыта, а ўвосень за пазычаны пуд будзе браць два. Ніякіх падзелаў не рабіў, а ўжо год 5 як пішуць асобна гаспадарку на трох (жывуць разам), каб ухіліцца ад падатку.

Ніяк ня хоча Прачкоўскі згадзіцца з камісіяй, якая запісвае іх гаспадарку разам.

— Як?, кажа, мне паасобку пішуць з 1921 году, ніхто ніякай прычэпкі ня меў, а цяпер прычапіліся. Няправільна.

— Нічога, сойдзе, ухмыльнуўся нехта.

Адчуваецца агульнае задаваленьне.

— Яшчэ ёсьць такі «тып» у нас, кажа мне ціханька малады хлапец, гэта Невядомскія.

Камісія выяўляе такую справу і ў Невядомскіх.

Папісалі.

— Сёньня нам трэба тут аслабаніць беднату,—кажа старшыня с.-савету, кажыце каго.

—Андрэя Паўлючонка.

— Саўку Пілішавага.

— Васіля...

Запісалі чалавек 15. Ускаквае адзін дзядзька.

— Чаму Паўлу аслабанілі, а мяне не, ці ён бяднейшы?

— А мяне чаму не,—крычаць другія.

Доўга спрачаліся. Галасавалі. Наастатак дагаварыліся. Вызвалілі ад падатку 19 гаспадарак, ці 42 проц. усіх гаспадарак. У абгаварэньні, каго вызваліць, прымалі ўсе актыўны ўдзел, у тым ліку сераднякі адкрыта выступалі супроць вызваленьня ад падатку таго, хто можа заплаціць.

Доўга яшчэ гутарылі лагозінцы ў бягучых справах і толькі к 12 гадз. уночы сталі памаленьку разыходзіцца.

Лагойскі р., Меншчына. **Я. К.**

АБ МАСАВАЙ ПРАЦЫ САВЕТАЎ.

Сельскія саветы Гомельшчыны ў апошні час аддаюць больш увагі масавай працы, чым гэта было да райёнаваньня. Па акрузе ў многіх саветах досыць добра працуюць камісіі. У значнай частцы сельсаветаў камісіі працуюць па пляну, у іх працу ўцягнут сялянскі актыў, які дапамагае с-савету ў працы. Вось, напрыклад, Хойніцкі с-савет, пры якім працуе 5 камісій, пляны іх выконваюцца на 80 пр. Усе пытаньні жыцьця сяляні прапрацоўваюцца ў камісіях, у якія ўцягнута каля 50 чал. актыву. Праведзена ўпарадкаваньне мястэчка. Вылучана месца для лазьні. Зямельная камісія пагаджае ўсе дробныя зямельныя спрэчкі

Пры Любовінскім с-с досыць добра працуюць камісіі: сельска-гаспадарчая, фінансавая, падатковая, і культурна-санітарная. Гэтыя камісіі прапрацоўваюць тыднёвыя даручэньні с-савету. Па ініцыятыве культурна-санітарнай камісіі, арганізован гурток па правядзеньні чытак на польской мове, а таксама на гэтым гуртку вучаць і пісаць на польскай мове.

Пры Цярэніцкім с-савеце Уваравіцкага раёну, дзякуючы настойлівай працы камісіі па ўпарадкаваньні, пракладзена вялікая гаць праз раку Уза, паміж вёскамі Цярэнічы і Іванаўка. На гэтай дарозе раней нельга было нават праехаць з парожнім возам, а зараз сяляне дзякуюць с-савет.

Працуюць камісіі пры Буда-Кашалёўскім, Патапаўскім, Чабатавіцкім і шмат іншых сельсаветах.

Але ў большай частцы саветаў па акрузе камісіі лічацца толькі на паперы і нічога ня робяць. У шмат якіх саветах працуе толькі старшыня і сэкратар сельсавету. Ёсьць выпадкі, калі камісіі ня ведаюць сваіх задач, вось прыклад: пры Любавінскім с-савеце сельска-гаспадарчая камісія, разглядаючы пратакол прэзыдыуму сельсавету, зрабіла сваю пастанову; „пратакол прэзыдыуму с-савету зацьвердзіць цалкам". Ня ўсе яшчэ камісіі ўцягваюць у сваю працу працоўную інтэлігенцыю, нацыменшасьці і жанчын.

Кіраваньне сходамі с-савету праводзіцца толькі ў тых вёсках, дзе працуе с-савет. Што датычыцца вёсак на далёкай адлегласьці ад с-савету, дык там прэзыдыум рэдка наведвае і сходы праходзяць па ініцыятыве саміх грамадзян.

Характар пытаньняў, разгледжаных на сходах, наступны:

За час красавік 27 г.—красавік 28 г. было праведзена па Казярускаму, Б. Кашалёўскаму і Патапаўскаму с-саветах сходаў—31; на іх разглядаліся пытаньні:—па справаздачы прэзыдыуму і пленуму с-саветаў—5, па палітканпаніях—7, па падатковай кампаніі—18, па гаспадарчых і грамадзкіх пытаньнях—29, розныя—9. Процант удзелу насельніцтва на сходах па ўсіх гэтых сельсаветах—35,75.

Па ўсіх пастановах можна назначыць, што гэткія не заўсёды носяць канкрэтны характар, а ёсьць і такія выпадкі, што і вусім ніякіх пастаноў на сходах не ўхваляюць. Напрыклад, па дакладу Казярыскага с-савету на сходзе прапанова зводзіцца да ўрэгуляваньня ўзаемаадносін с-савету з настаўніцай і барацьбе з хуліганствам. Сход вёскі Купрэяўкі Веткаўскага р. ад 6-II па пытаньні аб лесе мясцовага значэньня ўхваліў пастанову: сельсавету ўжыць меры для аховы лесу, выяўляючы парушчыкаў.

Кепская справа в уцягненьнем жанчын у працу сельсавету ня гледзячы на тое, што з боку РВК і АВК зазначэньняў было досыць. Уцягненьне і выхаваньне жанчын прыпыняецца тым, што працаўнікі с-савету ў большасьці не дапамагаюць ім у працы і часта прад'яўляюць жанчынам гэткія-ж патрабаваньні як і мужчынам, членам с-савету. Ня прыцягваюцца да працы сельсаветаў і дэлегаткі-практыкантці, якія фармальна прымацаваны да сельсавету. Трэба адзначыць, што з боку сельсавету ня праводзіцца ўпартай працы ні па ўцягненьні жанчын у працу, ні на пасяджэньнях сельсавету.

Галоўнай перашкодай па ўцягненьні жанчын у савецкае, грамадзкае і культурнае будаўніцтва зьяўляецца казённы падыход і вялікія запатрабаваньні да вылучэнцаў-жанчын, дзякуючы чаму ў іх няма ахвоты працаваць. У далейшым і РВК трэба дапамагаць сельсаветам, інструктаваць апошніх па ўцягваньні жанчын у працу—прыцягваць да строгай адказнасьці тыя сельсаветы, якія зьдзекваюцца над сялянкамі—членамі сельсавету.

Ня ўсе прэзыдыумы сельсавету разгарнулі практычную працу. Возьмем, напрыклад, Кавеєўскі с.-с. (Лоеўскага р.), які з часу ўзбуйненьня правёў толькі 2 пасяджэньні, на якіх разглядзеў 2 кампанейскія пытаньні: аб арганізацыі сельскай абіральнай камісіі і камісіі па рэалізацыі пазыкі.

А вось і Дзямінкоўскі с.-с., Веткаўскага р-ну праводзіць пасяджэньне прэзыдыуму толькі тады, калі не ўдаецца склікаць сход. Характар ухваленых пастаноў прэзыдыумам з пункту погляду канкрэтнасьці і абароны інтарэсаў беднаты вельмі нярэсты. Возьмем Любавінскі с.-с. Б.-Кашалёўскага раёну; па дакладу КСУ ён пастанавіў: працу СКСУ лічыць добрай. У далейшым трэба распачаць спагнаньне членскіх узносаў.

Гэты-ж сельсавет па пытаньні аб рамонце грэблі ад 4 верасьня 1927 г. ухваліў пастанову, у якой зусім не адбіта клясавая сутнасьць. Скліканьць агульны сход, на якім прапанаваць сялянам зрабіць рамонт грэблі, падзяліць яе на роўныя часткі паміж гаспадарамі вёскі.

Але ўсё-ж большая частка сельсаветаў працуе па пляну. Маюцца і паквартальныя пляны, аб выкананьні якіх прэзыдыум сельсавету рабіў справаздачу на пленумах сельсавету, на якіх прысутнічала ад 40 да 80 і больш сялян. (Цярэніцкі сельсавет, Чабатовіцкі, Уваравіцкага райёну, Сучаеўскі сельсавет, Лоеўскага р-ну, Патапаўскі сельсавет, Б.-Кашалёўскага райёну і інш.).

Прэзыдыумы сельсавету пачалі рабіць справаздачы на пленумах сельсаветаў толькі пасьля ўзбуйненьня сельсаветаў.

Дастатковае кіраваньне працай гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый ёсьць толькі там, дзе праца пастаўлена па пляну. У астатніх с.-саветах кіраўніцтва гэтымі арганізацыямі мае выпадковы характар. Вялікім недахопам у працы прэзыдыуму трэба лічыць адсутнасьць праверкі выкананьня ўхваленых пастаноў.

На сёньняшні дзень ёсьць яшчэ і такія сельсаветы, якія ніякіх пляноў працы ня маюць, а калі няма пляну, дык і працуюць яны дрэнна. Вось некаторыя з іх (дрэнна працуючых): Дземянкоўскі і Тарасаўскі с.-саветы, Веткаўскага райёну, Казераўскі—Лоеўскага райёну, Бярвенаўскі—Уваравіцкага райёну і шэраг іншых.

Прыкладаў аб дасягненьнях у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва на вёсцы можна падаць шмат. Так, напрыклад, Ліпнёўскі с.-с., Лоеўскага райёну пры самадзейнасьці насельніцтва і пры дапамозе каапэрацыі пабудаваў хату-чытальню. У вёсцы Н. Іванькава, Ручаеўскага с.-с. гэтага-ж райёну пад кіраўніцтвам сельсавету будуецца школа, якая ў гэтым годзе будзе скончана. Любавінскі с.-с. (польскі) Б.-Кашалёўскага р. таксама пабудаваў, шляхам самадзейнасьці, школу. Пабудаваў школу і Іванаўскі сельсавет, Уваравіцкага райёну, у якой ужо ў гэтым годзе вучыліся дзеці.

Вынікі: трэба ўзмацніць кіраўніцтва масавай працай с.-саветамі з боку вышэйшых устаноў, дзеля чаго неабходна, каб інструктары Акр. ВК і РВК выяжджалі ў сельсаветы на 5-7 дзён і вучылі с.-саветы лепш працаваць. Наладжваць выезды РВК і с.-саветаў у вёскі, дзе рабіць пасяджэньні па пытаньнях тэй вёскі, у якую выяжджалі. Пры правядзеньні кампаніі ўлічваць сялянскі актыў, арганізоўваючы апошні ў секцыі саветаў, якія трэба ажыцьцёвіць у шмат якіх саветах.

Е. Салдаценка.

Гомельшчына.

Кампартыя Заходняе Беларусі не дапусьціць паўтарэньня пружанскае гісторыі.

(Ліст з Заходняе Беларусі).

Усе мы дасканала ведаем, што галоўнай асновай панаваньня фашысцкага ўраду ў нас у Заходняй Беларусі зьяўляецца самы жорсткі і няшчадны рэжым белага тэрору, самае бязьмежнае эканамічнае і нацыянальнае прыгнечаньне. Але было-б памылкова думаць, што фашызм абмяжоўваецца толькі тэрорам. Усё, што робіцца перад нашымі вачыма, гаворыць аб тым, што фашысцкі ўрад побач з вастрэйшым тэрорам ужывае для ашуканства мас і перамогі сіл рэвалюцыі шырачайшую і шалёную «сацыяльную дэмагогію»; „ён мавэўрує", ён замазвае рознымі дэмакратычнымі сказамі фашысцкі характар сваёй дыктатуры, ён імкнецца ўнутры разлажыць лягер рэвалюцыйнае барацьбы.

У нацыянальнай палітыцы фашысцкі ўрад таксама імкнецца стварыць ураджаньне, што Пілсудзкі хоча зьмяніць «старую нацыянальную палітыку» ў адносінах да Заходняе Беларусі і Заходняе Украіны і палепшыць адносіны да „крэсаў". Уся гэта дэмагогія, усе гэтыя нязначныя ўступкі, урэшце, тыя працэсы клясавага расслаеньня, якія адбываюцца на беларускай вёсцы, параджаюць ваганьні ў верхавінах нацыянальна-вызваленчага і радыкальна-сялянскага руху. Ад нацыянальна-вызваленчага руху адышлі некаторыя элемэнты. У інтэлігенцкіх колах гэтага руху прыкметны хістаньні і дэзарыентацыя. Пілсудзкі робіць усё, каб гэтыя ваганьні паглыбіць, каб разлажыць рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух.

Было-б вельмі небясьпечна, калі-б мы ня лічыліся з магчымасьцю ўплыву ваганьняў, якія адбываюцца ў верхавінах нацыянальна-вызваленчага руху на некаторыя элемэнты нашае партыі і перш усяго на яе сялянскія арганізацыі. Апошні Пленум ЦК выразна падкрэсьліў, што нашіск гэтых ваганьняў **«на нашу партыю зьяўляецца адной з галоўных небясьпек для кампартыі Заходняе Беларусі, працуючай пераважна ў дробна-буржуазным абкружэньні».** Гэта небясьпека робіцца для нас асабліва моцнай, дзякуючы вельмі нязначнаму ліку пралетарыяў у нашай партыі і недастаткова трывалай загартаванасьці партыйнага актыву. Клясавы вораг націскае са ўсіх бакоў. Няшчадным тэрорам ён абстрэльвае нас. Дзеля змаганьня з ворагам партыя павінна быць аб'яднана адзінай воляй, павінна быць згуртавана жалезнай дысцыплінай і, маючы правільную палітычную лінію, павінна ўмець аб'яднана дзейнічаць.

А вось правядзеньне выбараў кіраўніцтвам Пружанскае арганізацыі, аб якім гаворыць рэзалюцыя Берасьцейскага АК, зьяўляецца якраз вострай процілегласьцю таму, якой павінна быць камуністычная партыя. Што-ж здарылася ў Пружанах?

У Берасьцейскай выбарчай акрузе ў выніку скасаваньня шэрагу рабоча-сялянскіх сьпісаў (№ 13 і г. д.) усе сілы рабоча-сялянскага блёку акругі згуртаваліся вакол застаўшагася сьпісу „сялянска-работніцкага аб'яднаньня" (сельроб лявіца), Наша партыя заклікала працоўныя масы галасаваць за гэты сьпіс рабоча-сялянскага блёку і магутным адзіным рэвалюцыйным фронтам выступіць проці фашысцкае дыктатуры. Як вядома, ваганьні сярод некаторых элемэнтаў нацыянальна-вызваленчага руху выявіліся і ў тым, што гэтыя элемэнты не пашлі адзіным фронтам з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі і ў некаторых мясцох спрабавалі выстаўляць і выстаўлялі свае паасобныя сьпісы. У Пружанскім раёне яны стварылі свой паасобны правы сьпіс «культурна-гаспадарчага сялянска-работніцкага аб'яднаньня». Партыя востра выступіла проці гэтых элемэнтаў, правільна зазначаючы, што яны ідуць разам з фашызмам, што, прыкрываючыся левым сказам і сьцягам „рабоча-сялянскага аб'яднаньня", яны хочуць уцягнуць масы ў логва згодніцтва з фашызмам. Берасьцейскі АК у сваю чаргу выступіў проці гэтага мясцовага сьпісу правых згодніцкіх элемэнтаў. І вось, кіраўніцтва Пружанскае арганізацыі ня выказала адпаведных палітычных дырэктыў акруговага камітэту. Замест таго, каб згодна гэтых указаньняў заклікаць масы га галасаваньня за рэвалюцыйны сьпіс рабоча-сялянскага блёку, Пружанскі камітэт парашыў падтрымаць мясцовы сьпіс правых элемэнтаў і вёў падрыхтоўчую працу ў масах за галасаваньне за гэты сьпіс. Таварышы з Пружанскага райёну ня выканалі дырэктыў АК па збору подпісаў рэвалюцыйнага сьпісу, у той-жа час, як ім былі сабраны подпісы для соймавага і сэнацкага сьпісаў згодніцкіх. Указаньняў галасаваць за рэвалюцыйны сьпіс таварышы ня выканалі і падтрымалі групоўку беларускіх інтэлігентаў, якія адышлі ад нацыянальна-вызваленчага руху.

У выніку такое злачыннае працы масы былі дэзарыентаваны і 9.000 галасоў у Пружанскім райёне прыпала на мясцовы сьпіс згодніцкаў, якія прыкрыліся левым сказам. Ясна, што гэта паслабіла сілы рабоча-сялянскага блёку, які ўсё-ж перамог у іншых частках акругі, атрымліваючы да 70.000 галасоў і праводзячы 3-х дэпутатаў ў сойм. Але 9.000 былі адарваны ад лягеру рэвалюцыйнае барацьбы.

Паводзіны кіраўнікоў пружанскае арганізацыі—гэта грознае зьявішча, і яго прайсьці нельга. Які-ж сэнс усёй гэтай гісторыі?

1. Бязумоўна, таварышы з пружанскае арганізацыі аб'ектыўна сыгралі на руку польскаму фашызму, паслабляючы сілы рэвалюцыйнага блёку рабочых і сялян, адцягваючы ад яго 9-цітысячную масу працоўных.

2. Таварышы не арыентаваліся ў тым новым, што характарызуе зараз абставіны, не зразумелі сутнасьці палітыкі фашызму, ня здолелі разгледзець і ацаніць тых ваганьняў, якія адбываюцца ў верхавінах нацыянальна-вызваленчага руху. Замест таго, каб кіраваць гэтым рухам, замест таго, каб правільнай палітыкай выкрываць вагаючыхся, адыходзячых і адышоўшых, замест таго, каб папераджаць гэтыя ваганьні і ізаляваць ад іх масы,—таварышы самі падаліся ўплыву гэтых ваганьняў. Вышла так, што група правых беларускіх дробна-буржуазных інтэлігентаў асядлала пружанскіх камуністаў і кіравала імі.

3. Таварышы ня здолелі разгледзець ворага. Гэта бясспрэчны факт. Пад левым сказам, пад назваю „сялянска-рабочага аб'яднаньня" яны ня здолелі ўбачыць фашысцкае лапы, якая працягваецца ўнутры нацыянальна-вызваленчага руху, ахапіўшы няўстойлівыя элемэнты і прыцягваючы іх да сябе. Таварышы аб'ектыўна дапамаглі чыннасьці гэтай лапы. Таварышы ўвалі ў аблуду масу, дэзарыентавалі яе і дапамагалі, як правільна адзначае рэзалюцыя АК, паслабленьню рэвалюцыйнага блёку, які змагаўся не на жыцьцё, а на сьмерць проці фашысцкае дыктатуры.

Побач з гэтымі момантамі, пружанскія таварышы ўчынілі вялічэзнае злачынства проці дысцыпліны партыі, проці самых элемэнтарных асноў, на якіх грунтуецца сіла і магутнасьць нашае партыі. Таварышы не падначаліліся вусім яснай і дакладнай дырэктыве АК аб тым, каб разгортваць агітацыю ў масах за галасаваньне за рэвалюцыйны сьпіс рабоча-сялянскага блёку. Гэтым самым яны падрывалі адзінства партыі, яе дысцыпліну, без якое ня можа быць цьвёрдага і бальшавіцкага кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой мас. Бо на што-ж была-б падобна наша партыя, калі-б кожны райён па сваім жаданьні мог падначальвацца і не падначальвацца дырэктывам і ўказаньням партыйнага кіраўніцтва. Такія паводзіны нясумясьцімы са знаходжаньнем у шэрагах сурова цэнтралізаванае, дысцыплінаванае камуністычнае партыі. Мы ніколі ня здолеем быць штабам, авангардным атрадам рэвалюцыі, калі мы ня будзем адзіны, ня будзем дружна дзейнічаць і змагацца.

Якія-ж урокі трэба атрымаць з тых аграмадных памылак, якія зроблены пружанскім

Праверка--самакрытыка--кантроль мас

Капрызы д-ра Царфіна.

З гады таму назад у Заслаўе прыехаў доктар Царфін. З першых дзён сваей працы д-р Царфін пачаў уводзіць у больніцы парадкі. Супрацоўнікі больніцы зараз-жа убачылі, што яны маюць справу з «вялікім адміністратарам». У той час другім доктарам быў д-р Мазо. Зараз-жа ў Царфіна і Мазо пачаліся канфлікты. Д-р Мазо, бачачы, што з Царфіным немагчыма працаваць, пераве́ўся ў другое месца. Акрадпраўаддзел накіраваў на месца Мазо т. Фрыдман—жанчына. З першых-жа дзён Царфін пачаў задзірацца з ёю ў часе працы, каб як-небудзь выклікаць сварку. Вельмі часта Фрыдман плакала ад свайго адміністратара, скардзілася на Царфіна ў РВК, але заўжды заставалася вінаватай яна. Канфлікт разьбірала выязная камісія, разглядаў і прэзыдыум РВК. Але Царфін быў апраўдан. Бачачы, што праўды не знайсьці ў заслаўскіх сазапаратах, Фрыдман адмаўляецца ад службы і выяжджае з Заслаўя. На яе месца зьявіўся д-р Іофэ. Доктар ён вельмі чулы, аказваў дапамогу беднаце ўдзень і ўночы, прымаў актыўны ўдзел у грамадзкай працы, чытаў лекцыі, ладзіў дысп:ты і г. д. Адным словам, д-р Іофэ карыстаўся ў насельніцтва вялікім аўтарытэтам. Царфіну гэта не ўпадабалася, бо ён сам вельмі далёк быў ад насельніцтва і грамадзкай працы. Ён зараз-жа пачаў вышукваць розныя матывы для спрэчак і канфліктаў. Ня лічачыся ні з чым, выступаў і на сходах супроць д-ра Іофэ. Іофэ цярпеў да пары, а потым пачаў шукаць выхаду з такога становішча. Падаў заяву ў РВК. Але к вялікаму жалю Царфін вышаў сухім з вады.

Царфін быў апраўдан, а д-ра Іофэ прэзыдыум РВК ухваліў перавесьці ў вясковую больніцу. Д-р Іофэ тады зусім адмовіўся ад працы і выехаў з Заслаўя. Цяпер Царфін лічыцца ў Заслаўі царом і богам. Але прадзелкі Царфіна даходзяць да крайнасьцяй. Напрыклад, наклікалі яго да хворай беднай жанчыны Багановіч, але ён катэгарычна адмовіўся аказаць ёй дапамогу, ня гледзячы на сур'ёзную хваробу.

— Калі да гэтага часу, кажа, лячыў хворую Іофэ, няхай і цяпер лечыць, а калі ён у Менску, няхай хвароба пачакае яго.

Другі выпадак, у сялянкі Берштэйн Рывы—дэлегаткі—захварала сур'ёзна рука, патрэбна была апэрацыя і яна рашыла рабіць яе ў Менску. Калі хворая Берштэйн пасьля апэрацыі прыехала з Менску і вярнулася да Царфіна, каб зрабіць перавязку, дык Царфін прагнаў яе з хаты.

— Вы апэрацыю рабілі ў Менску, няхай вам у Менску і робіць перавязку.

Хворая заплакала і пайшла ў страхкасу. З прычыны таго, што сялянка Берштэйн ня сябра прафсаюзу, упаўнаважаны страхкасы накіраваў хворую да старшыні РВК, бо сам ня ведаў што рабіць. Такіх выпадкаў вельмі многа і РВК зусім не рэагуе на гэта. Старшыня РВК т. Шэлег вельмі добра адзываецца аб Царфіне, заўсёды яго абараняе, а чаму—нікому не вядома. І ў гэты раз пасьмейнаму напісаў Царфіну вельмі мяккую запіску, у якой просіць паважанага Царфіна распарадзіцца, каб дзяжурны зрабіў сялянцы перавязку. Пры гэтым т. Шэлег піша: «ведь гр-ка Берштейн по своей бедности не может ехать в Минск ради перевязки».

Невядома, чаму т. Шэлег так шчыра абараняе бюракрата Царфіна.

На наш погляд, бюракратам ня месца ў савецкіх установах. Іх месца павінны заняць чырвоныя дактары, якія стаяць блізка да масы. **Вока.**

Моцны сон Гомельскага акрсавету т-ва „П. Н".

Яшчэ на вясеньнім пленуме Цэнтральнага Савету Таварыства «Прач Няпісьменнасьць» адзначалася, што ў Гомельскай акрузе таварыства слаба працуе, а правільней кажучы яго зусім няма.

— Як слаба працуем, як няма,— абурыўся тады прадстаўнік акруговага савету Гомельшчыны т. Гоманак.

— Мы ня толькі працуем, а ў нас нават ліквідацыя ідзе... лікпункты і нагул... усё стаіць добра, дадаў т. Гоманак і настаяў, каб у рэзалюцыі ня было пункту аб слабой працы Гомельскага акрсавету таварыства «Прач Няпісьменнасьць».

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету Таварыства імкнуўся ажывіць працу гомельчан, выклікаў іх два разы на сваё пасяджэньне, але...

Цэнтральны Савет пастанаўляе, а Гомельскі разважае: добрая рэч сон—крыху яшчэ пасьпім.

Надышоў другі пленум Цэнтральнага Савету Таварыства «Прач Няпісьменнасьць». Зноў кажуць, што ў Гомельшчыне таварыства амаль што нічога ня робіць і працы па ліквідацыі ня відаць. Тут ужо сьведчыў прадстаўнік Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі, але...

Таварыш Гоманак па звычаю—як нічога ня робіцца, як мы сьпім і, пачухаўшы патыліцу, гледзячы на столь, пачаў даказваць,—ды ў нас ня толькі што, а ў нас лікпункты каторыя... ды ў нас у Гомельшчыне таварыства ледзьве ня 5000 чалавек няпісьменных з лікпунктаў сёлета выпускаем... у нас наогул ідзе ліквідацыя пісьменнасьці,—зарапартаваўся т. Гоманак.

Але ўжо на гэтым пленуме не далі веры прадстаўніку Гомельскага акрсавету, бо ўжо вельмі відавочна было, як ён, назіраўшы на столь, апэраваў лічбамі і праца таварыства была прызнана слабай.

Прайшоў вядомы час, прэзыдыум Цэнтральнага Савету ўжо ў трэці раз выклікае прадстаўніка Гомельшчыны на сваё пасяджэньне і хоча сумесна абгаварыць, як падрыхтавацца да наступнага году і як ажывіць працу акруговага савету.

Але і ў трэці раз з Гомелю ніхто ня прыехаў, бо і дагэтуль там у акрсавеце т-ва «П. Н.» панує моцны сон.

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету прымушан быў за такія адносіны да працы паставіць т. Гоманаку на від, але мы думаем, што не разбудзіць яго і гэтае мерапрыёмства. Зараз ужо патрэбна ўмяшацельства гомельскай РСІ, бо інакш і новы вучэбны год пройдзе з такім-жа «посьпехам», як і 1927-28 г. **М-ша.**

Чубараўшчына на параходзе „Марат".

ГОМЕЛЬ. Вясной гэтага году на параход «Марат» у якасьці паварыхі была прынята т. Н. В. Спачатку яна карысталася пашанаю каманды параходу, якая да яе адносілася патаварыску. Але з некаторага часу камандзір параходу Ганчароў і мэханік Жукаў зьмянілі да яе свае адносіны і пачалі дамагацца, каб яна згадзілася жыць з імі.

Але як ажыцьцявіць сваё жаданьне. Ганчароў, як майстар пераказу непрыстойных жартаў пачынае „зондировать почву" пры дапамозе расказікаў, а Жукаў умывае свае „мэтады". Далей пачынаецца прыставаньне і угаварваньне, каб яна жыла з імі. Ганчароў месцам угаворваў выбраў сваю каюту, потым камандзірскі мосьцік і кухню, а Жукаў карыстаючыся правам землячка, пачаў заходзіць у каюту Н. В.

Такое ціканьне ня спынялася ў працягу 2-х месяцаў. Н. В. прымушана была у вольны час хавацца куды-небудзь. На палубу яна выходзіла толькі тады, калі там была ўся каманда.

Бачачы, што ўсе гэтыя мэтады не дапамагаюць, Ганчароў, карыстаючыся адміністрацыйнымі правамі, пачынае вымагаць ад Н. В. «падзякі» за тое, што ён прыняў яе на працу.

У іншым выпадку высажу на першай кручы.

Жукаў пачынае зьдзекавацца над ёй.

Пагрозы і зьдзекі таксама не дапамаглі. Значыць засталося толькі адно, а ўласна распачаць проці Н. В. агідную кампанію, даводзячы камандзе, што яна самы «нагодны элемэнт», якому ня месца на параходзе і, не саромячыся, каманды яны пачалі яшчэ больш над ёю зьдзекавацца.

У гэты час на адным з сходаў параходу ставілася пытаньне аб прыёме Н. В. у члены прафсаюзу. Але, ня гледзячы на ўсе дамаганьні «кампаніі», яна ўсё-ж была прынята ў члены саюзу.

Ганчароў і Жукаў былі вельмі незадаволены пастановаю агульнага сходу і яны пачалі агітаваць сярод членаў рэвізыйнае камісіі аб ухвале пратэсту наконт прыёму Н. В. у члены прафсаюзу. І вось на імя прафупаўнаважанага параходу «Марат» падаецца заява за подпісам Жукава, у якой патрабуецца перагляд заявы Н. В. аб прыёме яе ў члены саюзу, матывуючы сваё патрабаваньне тым, што «паводзіны» яе ні вытрымліваюць ніякае крытыкі. Хоць гэта справа не рэвізыйнае камісіі, але прафупаўнаважаны пачаў нярэчыць—рэвізыйная камісія заяўляе падпачаліцца і заява была прынята, трапіўшы не ў месцом, а ў культкамісію.

Такія зьдзекі прымалі Н. В. да таго, што аднойчы яна кідаецца ў рэчку пад калёсы параходу,

Толькі выпадкова яна была выратавана ад сьмерці. Калёсы параходу паранілі ёй галаву і сьпіну. Такім чынам мы маем яўны не патрабуючы асобных доказаў учынак «чубараўшчыны», з выкарыстаньнем службовых і грамадзкіх абавязкаў.

Таму цікава даведацца, чым у гэты час займаліся партыйная частка каманды і прафантыву параходу, ці яны нічога аб гэтым ня ведалі, ці ІХ НЯ БЫЛО на параходзе. Ведалі, але баяліся заявіць.

Гэты выпадак заслугоўвае выключнае ўвагі з боку грамадзкасьці і сьледчых судовых органаў. **Н.**

Нядбайнасьць Белдзяржстрою.

Белдзяржстрой прыступіў да пабудовы галянтарэйнай фабрыкі ў Менску толькі з другой паловы мая. Зараз ідзе работа па пабудове грэбеннага корпусу,—ужо зложаны фундамант.

Перапрацоўка праэкту была даручана ВСНГ Белдзяржстрою, які добра ведаў, што фабрыка будзе будавацца з бэтанітавага каменю тыпу „Селянін".

Ведаць гэта адно, а рыхтавацца да будаўніцтва—другое...

На будаўніцтва фабрыкі патрэбна было-б 25.000 штук бэтанітавых каменьняў, але Белдзяржстрой дагэтуль падрыхтаваў апошніх усяго толькі... 2000 штук.

Пабудова корпусу для вырабу гузікаў яшчэ не распачалася, ды і ня можа распачацца, бо Белдзяржстрой праэкту гэтага корпусу яшчэ не зрабіў. Дагэтуль мы ведаем, што ва ўсіх недарэчнасьцях з разгортваньнем будаўніцтва прадстаўнікі Белдзяржстрою вінавацілі ўстановы і арганізацыі, якія своечасова не падрыхтаваліся да будаўніцтва. Зараз-жа мы бачым, што і сам Белдзяржстрой таксама ў гэтым напрамку не бяз грэху.

ВСНГ абсьледваў будаўніцтва галянтарэйнай фабрыкі і прызнаў работу Белдзяржстрою нездавальняючай і вінавата тут выключна арганізацыйная непадрыхтаванасьць Белдзяржстрою.

У сувязі з заця́жкай будаўніцтва фабрыкі і прапановай ВСНГ скончыць пабудову яе абавязкова ў бягучым годзе і к тэрміну, зараз Белдзяржстрой корпус гузікавай фабрыкі замест бэтанітавага каменю будзе будаваць першы паверх з цэглы, а гэтае ўжо, зразумела, ня можа не адбіцца на ўдаражэньні кошту самога будаўніцтва.

Цікава адзначыць, што, дзякуючы адсутнасьці распрацаванага праэкту гузікавага корпусу, дагэтуль нельга заключыць з Белдзяржстроем дагавору на пабудову фабрыкі. Апрача таго, такое становішча не дае магчымасьці своечасова набыць катлы для цэнтральнага апаленьня.

Калі-ж, урэшце, будзе зроблены праэкт гузікавага корпусу галянтарэйнай фабрыкі?

Цікава таксама, у якую капеечку ўляціць гэта арганізацыйная непадрыхтаванасьць? **В. З—ў.**

Пакрываюць растратчыкаў.

У Жыважодавіцкай краме Чырвона-Слабодзкага спаж. т-ва рэвкамісія выявіла растрату ў 117 руб. Што зрабіла праўленьне па гэтай справе? А вось што: прапанавалі загадчыку крамы ў месячны тэрмін пакрыць гэты доўг, а пасьля месяца зрабіць другую рэвізію. Гэтым далі яму магчымасьць абвешываць і абмерваць і рабіць усё, каб заткнуць гэту дзюру. Праз месяц адбылася другая рэвізія і што-ж,—за гэты месяц загадчык крамы Ганчар пакрыў толькі 20 руб. і выявілася ўжо канчаткова, што там ёсьць растрата ў суме 97 руб. Што-ж зрабіла праўленьне? Тое самае, што і ў першы раз,—што ў цябе растрата—нічога, таргуй на здароўе, толькі папоўні растрату. А як папоўніць, з якіх сродкаў, нічога не сказала, ці абвешываць, ці абмерваць, ці яшчэ як шальмаваць, каб пакрыць доўг. Знайшоўся адзін грамадзянін, які напісаў аб гэтым заяву помпракурору. Пракурор затрэбаваў раз ад Чырвона-Слабодзкага с.-т. акты рэвізіі і пратаколы пасяджэньня, затрэбаваў у другі раз,—маўчыць праўленьне. Да гэтага часу на справе ня было ніякага сьледзтва, усе «працуюць» сабе наздароўе ды і пасьмейваюцца над тымі, хто хацеў убачыць праўду. **Селькор Вока.**

Чырвона-Слабодзкі р., Бабруйшчына.

Як былы панскі аканом.

У савгаспадарцы Цацорына (Круглянскі раён, Аршанщчына) працуе загадчыкам нехта Часнавіцкі стары памешчыцкі служака. Часнавіцкі ня кідае старых звычаяў, са сваёй кампаніяй старэйшым рабочым Мышлёнінавым і бухгальтарам Часнавіцкі трымае рабочых у жорсткім рэжыме. Супроць «зава» ніхто не пасьмее сказаць ні слова:

— «Я тут гаспадар, што хачу, тое і раблю, каго хачу—бяру на працу, каго хачу—звальняю».

Рабочыя баяцца на агульных сходах нават заікнуцца, ня толькі крытыкаваць недахопы ў працы загадчыка.

Загадчык разагнаў адзін раз жаночы сход. Старэйшы рабочы таксама абыходзіцца з рабочымі, нібы з жывёлай, грубы, няма спачуваньня, таксама як і ў паважанага загадчыка.

Нядаўна камісія выкрыла ў савгасе толькі па малочнай справе ў 1500 р. растрату.

Загадчык не зьвярнуў увагі на тое, што амаль усе рабочыя ўступілі ў групу бабцістых, арганізаваную селянінам в. Заручча Цалавальнікавым.

Адчуваючы нібы нейкую небясьпеку, Часнавіцкі вывозе мэблю з савгасу.

Часнавіцкі заяўляе:

— Не баюся нікаго, мяне, як старога служаку, падтрымае трэст.

Я лічу, што трэст можа «падтрымліваць» такіх людзей толькі тады, калі іх вымятаюць з савгасаў. **Станіслаў.**

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА У БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

(Па матар'ялах НК РСІ БССР).

Вынікі нядаўна скончанага абсьледваньня капітальнага будаўніцтва рэспубліканскае прамысловасьці Беларусі разгарнулі малюнак буйных недахопаў, пагражаючых будаўніцтву, прыпыняючых яго тэмп і зьніжаючых эфэкцыйнасьць капітальных укладаў.

Укараненьне плянава-каштарыснай дысцыпліны аздаравіць прамысловае будаўніцтва.

Зусім бяссрэчнай зьяўляецца ісьціна аб неабходнасьці эканамічнага абгрунтаваньня плянаў капітальнага будаўніцтва дакладнымі падлікамі, асабліва ў частцы сыравінных рэсурсаў. Між тым па шэрагу будаўніцтваў (Бабруйскі дрэваапрацоўчны камбінат, Віцебскі маслабойны завод і інш.) гэта ісьціна, вызначаючая ў выніку лёс нанова будуемага аб'екту і эканамічную эфэкцыйнасьць капітальных выдаткаў, недастаткова ўлічана беларускімі трэстамі.

Пачатак будаўніцтва бяз плянаў—зьявішча агульнае амаль што па ўсіх абсьледаваных аб'ектах. Асабліва характэрным і навучальным у гэтых адносінах зьяўляецца будаўніцтва сярніковае фабрыкі «Днепр», дзе перад пачаткам працы была выказана поўная неасьвядомленасьць аб тэхніка-эканамічнай прыродзе будуемае фабрыкі; інакш кажучы, кіраўнікі будаўніцтва, распачаўшы працу ня мелі яснага і поўнага ўяўленьня аб тым, што прадстаўляе сабой новая фабрыка. Адгэтуль—шматлікія взрываны плянаў, якія складаліся ўжо ў ходзе будаўніцтва і выяўлялі ваганьні ў вызначэньні разьмераў прадукцыйнасьці фабрыкі і мэтаду вытворчасьці.

Адсутнасьць агульнага пляну ўсяго будаўніцтва Бабруйскага камбінату выклікала ўжо ў ходзе працы і пасьля атрыманьня імпартнага абсталяваньня сумненьні і ваганьні адносна рэнтабельнасьці і мэтазгоднасьці пабудовы бачарнага цэху.

Само праэктаваньне мае таксама шмат ненармальных зьявішчаў, да ліку якіх неабходна аднесьці: недастаткова прадуманае складаньне праэктаў, якія падпалі ўжо пераскладаньню ў ходзе будаўніцтва, несваечасовае праэктаваньне, якое не дае магчымасьці выгоднае і своечасовае загатоўкі будаўнічых матар'ялаў і прымушае праводзіць працу і ўзімку, і ўвосень, калі прадукцыйнасьць працы і якасьць яе бязумоўна зьмяншаецца. Пачатак праэктаваных работ па шэрагу аб'ектаў характарызуецца таксама недавладным дасьледваньнем грунту і мясцовасьці, не гарантуючымі ўстойлівасьці распачатых пабудоў. Даволі зазначыць, што па сярніковай фабрыцы «Днепр» помпавая станцыя пабудавана на мясцовасьці, падпадаючай затапленьню ў часе разьліву ракі; сьвідраваньне шчыліны для артэзіянскае студні, якое каштуе 10 тысяч рублёў, аказалася зусім бескарыснай працай.

Адсутнасьць плянавага пачатку ў будаўніцтве не магло, разумеецца, не адбіцца балюча на ходзе працы. Перш за ўсё неабходна падкрэсьліць факт правядзеньня працы бяз усякіх каляндарных плянаў, увязаных з фінансавымі дзяжкасьцямі. Пры такім становішчы тэмп працы вызначаўся толькі наяўнымі фінансавымі магчымасьцямі, а ня плянавым пачаткам. У гэтых адносінах зноў-такі даволі цікава адзначыць, што на фабрыцы „Днепр" выявілася адсутнасьць сродкаў, якая выклікала неабходнасьць згортваньня працы на паўтара гады, а адгэтуль—і ня зусім вытворчую мабілізацыю ўкладзеных капіталаў.

У самым ходзе будаўніцтва мы таксама маем шэраг ненармальных зьяў, якія выявіліся, ў перапробках і ломках ужо зробленых работ, правядзеньні працы з непатрэбнымі запасамі трывалasьці і г. д. Надзвычайна хваравіта адбілася на ходзе будаўніцтва поўная недапасаванасьць між часам пабудовы прамысловых памяшканьняў і карпусоў і часам арганізацыі парасілавое гаспадаркі, выцякаючая зноў-такі з адсутнасьці плянавасьці наогул. Пры амаль што поўнай своечасовасьці прамысловых памяшканьняў па Дабруской папяровай фабрыцы «Герой Труда» і наліччы значнае часткі імпартнага абсталяваньня няма яшчэ нават праэкту сілавое станцыі. Пры такім становішчы ўсе закончаныя пабудовы і набытае абсталяваньне ляжыць мёртвым капіталам, а вынікі—зацяжка эксплёатацыі і пуску пашы ранае фабрыкі на 2—2 з пал. гады. Амаль што такое-ж становішча мы назіраем і па Бабруйскім камбінаце, дзе толькі пасьля скончэньня пабудовы лесапільнага цэху распачалі арганізацыю парасілавое гаспадаркі.

Побач з такімі зьявішчамі, калі імпартнае абсталяваньне ляжыць мёртвым капіталам, чакаючы пабудовы прамысловых карпусоў (Дабруская фабрыка, Бабруйскі камбінат) абсьледваньне выявіла зьявішчы процілеглага характару, калі пабудовы закончаны, а абсталяваньня няма. Сярніковая фабрыка «Днепр» ужо скончана, але яшчэ няма значнае часткі абсталяваньня. У выніку фабрыка поўнасьцю не нагружана, некаторыя цэхі не працуюць, і выпушчаемая ёю прадукцыя больш дарагая ў параўнаньні з прадукцыяй старое фабрыкі «Днепр».

Адсутнічае плянавая дысцыпліна таксама ў галіне фінансаваньня будаўніцтва; відаць гэта з таго, што трэсты пачынаюць фінансаваць працы са сваіх зваротных сродкаў і накапленьняў, а па меры разгортваньня будаўніцтва займаюцца адпуканьнем іншых крыніц фінансаваньня для скончэньня капітальных прац, якія вельмі часта непрадугледжваюцца першапачатковымі плянамі і па свайму кошту выходзяць за іх межы.

Гэткія ў агульных рысах асноўныя недахопы ў галіне капітальнага будаўніцтва, для зьнішчэньня якіх НК РСІ БССР намеціў цэлую сыстэму мерапрыёмстваў. Гэтыя мерапрыёмствы ў асноўным складаюцца з наступнага:

У галіне плянаваньня будаўніцтва пастановы НК РСІ прадугледваюць катэгарычную забарону будаўніцтва без дэтальна распрацаваных плянаў і праэктаў. Калі да апошняга часу пляны будаўніцтва несваечасова зацьвярджаліся таму, што яны былі непарыўнай часткай агульнапрамысловых плянаў, складаньне і зацьверджаньне якіх іншы раз па некаторых прычынах зацягвалася на доўгі час, дык для зьнішчэньня гэтага зацягваньня НК РСІ БССР стаў на пункт погляду неабходнасьці вылучэньня з агульнай сыстэмы паказальнікаў усяе сумы пытаньняў па капітальнаму будаўніцтву. Ня менш важнай зьяўляецца пастанова НК РСІ аб неабходнасьці прыстасаваць прадстаўленьне гадавых плянаў капітальнага будаўніцтва на зацьверджаньне вышэйшых урадавых органаў да моманту разгляду імі бюджэту з тым, каб да пачатку году маглі быць забраніраваны сродкі, неабходныя для выкананьня вызначаемага на кожны год цьвёрдага мінімуму капітальных прац.

У сыстэме мерапрыёмстваў, накіраваных да ўпарадкаваньня праэктнай справы (своечасовасьць праэктаваньня, увязка яго з магчымасьцямі больш выгоднай загатоўкі матар'ялаў і г. д.), трэба асобна выдзеліць забарону праэктаваць паасобныя часткі будаўніцтва бяз сувязі з арганізацыяй пара-сілавой гаспадаркі.

У галіне арганізацыйнай НК РСІ прапануе ўжываць падрадны спосаб выдзеньня працы, паколькі існуючы на некаторых будаўніцтвах гаспадарчы спосаб адрозьніваецца дарагім і вялізарным апаратам, а галоўнае—адсутнасьцю матар'яльнай адказнасьці за якасьць прац.

У галіне фінансаваньня НК РСІ выказаўся за максымальную канцэнтрацыю сродкаў па кожнаму будаўніцтву, за ўстанаўленьне цьвёрдых фінансавых плянаў і згуртаваньне ўсіх бюджэтных асыгнаваньняў у органах доўгатэрміновага крэдытаваньня, якія павінны ўстанавіць кантроль над правільным скарыстаньнем асыгнаваных сродкаў.

НК РСІ вызначыў шэраг мерапрыёмстваў, накіраваных да зьнішчэньня недахопаў пры закупцы імпартнага абсталяваньня, да больш мэтазгоднага скарыстаньня заграніччнага вопыту. Асаблівую ўвагу НК РСІ зьвярнуў на максымальнае ўцягненьне рабочых мас да абмеркаваньня плянаў будаўніцтва і на пытаньні патаненьня будаўнічых прац.

Укараненьне плянава-каштарыснай дысцыпліны ў будаўніцтва—вось асноўная ўстаноўка і думка, якая праходзіць чырвонай ніткай праз пастановы НК РСІ БССР аб аздараўленьні і ўпарадкаваньні рэспубліканскага прамысловага будаўніцтва.

В. Д. АДЛЕРШТЭЙН.

За невыкананьне дырэктывы аб 20 проц. скарачэньні выдаткаў--да адказнасьці.

Праўленьне Заходніх чыгунак прадпісвае ў партыі і ўраду аб скарачэньні адміністрацыйна-ўпраўленчых выдаткаў у першым паўгодзьдзі 1927-28 г. на выканала, складаючы зьбераженьні толькі ў разьмеры 11 проц., замест чакаемых 23 проц., што стварае пагрозу невыкананьня гэтае дырэктывы да канца бягучага гаспадарчага году, асабліва па лінейнаму апарату, дзе пашарпляце замест эканомі, маецца перавыдатак. У пытаньні аб скарачэньні адміністрацыйна-ўпраўленчых выдаткаў ня было адпаведнае і своечасовае ўстаноўкі, як з боку НК Шляхоў, так і праўленьня чыгунні, а роўна дастатковых мерапрыёмстваў з боку кіраўнічай і лінейнай адміністрацыі.

Калегія НК РСІ Беларусі пастанавіла прасіць Партколегію ЦКК КП(б)Б прыцягнуць да партыйнае адказнасьці вынаваючага абавязкі старшыні праўленьня Заходніх чыгунак т. Серабракова за невыкананьні дырэктывы партыі аб 20 проц. скарачэньні адміністрацыйна-ўпраўленчых выдаткаў.

За позьняе зачыненьне кредытаў па лініі, недастатковае кіраўніцтва і адсутнасьць кантролю за выкананьнем дырэктывы ўраду ў частцы 20-проц. скарачэньня адміністрацыйна-ўпраўленчых выдаткаў начальніку фінансавага аддзелу праўленьня Заходніх чыгунак т- Невяровічу калегія НК РСІ абвясьціла выгавар.

Праўленьню Заходніх чыгунак прапанаваны цэлы шэраг мерапрыёмстваў, накіраваных да поўнага ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі і ўраду аб 20 проц. скарачэньні адміністрацыйна-упраўленчых выдаткаў да канца бягучага гаспадарчага году.

Дзяржфінкантролю Заходніх чыгунак прапанавана ўзмацніць рэзізійны нагляд за адміністрацыйна-ўпраўленчымі выдаткамі.

Узьнята хадайніцтва перад НК РСІ Саюсу ССР зьвярнуць увагу НК Шляхоў на адсутнасьць належнага і своечасовага кіраўніцтва НК Шляхоў у правядзеньні 20 проц. скарачэньня і прапанаваць НК Шляхоў перагледзець існуючую каштарысную намэнклятуру з тым, каб выдатні, падлягаючыя дэкрэтнаму скарачэньню, атрымалі поўны адбітак у справаздачы чыгункі за 27-28 г. і ў каштарысе на 28-29 год.

Пытаньне аб парадку вынарыстаньня ўстаноўленых НК РСІ Беларусі лішкаў у суме 434.503 руб. па адміністрацыйна-ўпраўленчых выдатках у каштарысе Заходняе чыгункі перададзен на разгляд НК РРІ СССР.

КАМУНА ІМЯ КАРЛА ЛІБКНЭХТА

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

За вярсту ад 14 разьезду (каля Быхава) ужо можна ўбачыць на ўзгорку 2-хпавярховы дом, густа абсаджан прыгожымі ліпамі. Пад узгоркам—рэчка Лахва, за ёй вялікі сасновы бор. Тут раней быў панскі маёнтак «Сарочына». Сам пан у маёнтку рэдка бываў, тут яго аканом жыў.

Так было да 1917 г.

У 1918 годзе ў б. маёнтку Сарочына арганізавалася з б. панскіх батракоў і акружаючага бяднейшага сялянства **камуна імя Карла Лібкнэхта.** Пачалі працаваць роўна. Без начальства, без падначальных—улада калектыву, у якім чуюцца вольныя, жыцьцёрадасныя працоўныя галасы.

Зараз у камуне налічваецца 155 камунараў (з якіх амаль палова жанчын).

Крыху аб мінулым камуны.

Камуна арганізавалася ў 1918 годзе па ініцыятыве тамашняга селяніна Сарокіна.

Нямецкая і польская акупацыі, бандытызм—усё гэта адбівалася на нармальным жыцьці камуны. У 1924 годзе бандыты падпалілі хлеў камуны, дзе згарала каля 70 кароў і шмат дробнай жывёлы.

Былі цяжкія часы, але камуна ішла наперад цьвёрда, упэўнена, перамагаючы ўсе перашкоды і ўнутры самой камуны.

Працу яе падрывалі самі кіраўнікі яе. Досыць упамянуць аб б. старшыні праўленьня Дзем'яновічу, які безгаспадарча вёў працу і меў хаўрус з прыватнікамі (аб гэтым ужо нераз пісалася ў друку ў 1927 і гэтым годзе). Упартая воля працоўных перамагла ўсе цяжкасьці.

Гаспадарка камуны.

Гаспадарка камуны вялікая. Ёсьць крухмальны завод, 2 млыны (паравы і вадзяны), лесапілка, сталярная і кузьня. Гэтыя падсобныя галіны даюць значную эканомію і дапамагаюць больш шпарку разьвіцьцю камуны.

Сельская гаспадарка вядзецца культурна па 10-польным севазвароце. Зямлі камуна мае 180 дз., лугу—80 дз., лесу—104 дз. Больш за ўсё сеецца бульбы, таму, што яе апрацоўвае крахмальны завод. Сёлета засеяна: аўсу—33 гэктары, бульбы—47 гкт., канюшыны—18 гкт., лёну—3,95 гкт. і вікі з аўсом—3,32 гкт. У далейшым неабходна зьвярнуць увагу на яшчэ лепшае выкарыстоўваньне зямельнай плошчы (травы, угнаеньне і інш.).

Жніво пры дапамозе трактара.

Жывёлаводзтва паступова паляпшаецца, падбіраюцца лепшыя гатункі. Разьвіцьцю жывёлаводзтва зрабіў вялікую перашкоду пажар.

Зараз у камуне маецца: кароў—78, цялят—23, быкоў—4, авец—46, сьвіней—60, парасят—30, коняй—28. Скотныя будынкі патрабуюць пераабсталяваньня і пашырэньня і пабудовы новых хлявоў.

За добрую пастаноўку жывёлаводства камуна ў Быхаве атрымала пахвальны ліст.

Машынізацыя сельскай гаспадаркі не адстае ад жыцьцёвых запатрабаваньняў. У гэтай справе камуна шагнула наперад. Камуна мае 3 трактары, 1 веялку, 2 малатарні, 5 грабалак, 2 жаткі і 3 касілкі. Зараз адчуваецца патрэба ў рядавой сеялцы, якую камуне неабходна купіць.

Садоўніцтва і пчалярства таксама не адстаюць ад агульнага разьвіцьця гаспадаркі камуны. На чале гэтых галін гаспадаркі стаіць стары камунар Сазоненка Васіль, які старанна вядзе сваю працу.

Быт камунараў.

Па магчымасьці і патрэбнасьці. Гэты лёзунг ужываецца ў жыцьці камуны, але яшчэ ня цалкам. Поўнага абагуленага жыцьця ў камуне яшчэ няма: кожнаму камунару даюць месячную пэнсію (36 руб.), з якой частку выкідваюць на харчаваньне, а за рэшту пэнсіі камунар самастойна купляе сабе адзеньне і інш. Харчаваньне ў камуне агульнае за агульным сталом.

Пераход у бок калектыўнасьці ў камуне, бязумоўна, зроблен. Кожны камунар камуну лічыць сваёй і адносіцца да яе, як да агульнай, калектыўнай. Трэба адзначыць, што камунары камунай задаволены.

Жывуць камунары ў 2-хпавярховым доме; крыху цеснавата, але нічога—жыць можна. Працуюць 8 гадз., і кожны робіць адну якую-небудзь працу.

У лазьні мыюцца разам жанчыны і мужчыны, і нічога. Адзін стары камунар мне сказаў:—«пад старасьць прышлося мыцца разам з бабамі, мыемся, можна сказаць толкам, памыемся і пойдзем».

У культурна-бытавых адносінах камунарам трэба яшчэ шмат працаваць над сабой.

Узяць к прыкладу такія рэчы: абедаюць у шапках, нават не памыўшы рукі пасьля працы, часта можна пачуць лаянкі і ня толькі ад мужчын, лаюцца і маладыя дзяўчаты.

Вольны час камунарамі скарыстоўваецца няправільна, а яго ёсьць многа. Можна было-б улетку скарыстоўваць вольны час у карысных мэтах, асабліва па калектыўным выхаваньні камунараў. Чыстата падтрымліваецца, можна сказаць, здавальняюча.

Камуна павінна ўсімі мерамі прыняцца за палепшаньне быту і культуры.

Уплыў камуны на ваколічнае сялянства.

У мінулыя гады, калі камуна была яшчэ слабая, сялянства да яе адносілася ня зусім даверчыва. Цяпер **сяляне да камуны адносяцца добра, бо яны бачаць, што толькі ў камунах і калектывах можна добра жыць.**

Лепшай агітацыяй для сялянства зьяўляецца ўраджай камуны ў параўнаньні з ураджаем індывідуальных сялянскіх гаспадарак на такой-жа самай зямлі.

Уб ураджаі за апошні год лічбы паказваюць наступнае:

Ураджай з дзесяціны:

	У камуне	У сялян
Жыта . .	60 пуд.	35 пуд.
Авёс . .	40 п.	20 п.
Бульба.	1.100 п.	650 п.

Што датычыцца ўдойнасьці кароў, то такія самыя каровы камуны, як і ў сялян даюць 3 разы больш малака.

Апрача гэтага, камуна робіць вялікі ўплыў на паляпшэньне сялянскіх гаспадарак. Камуна абменьвае сялянам культурнае насеньне і прасоўвае ў вёскі добрую гатункову жывёлу (злучка, прадажа цялят, парасят). Напрыклад, у мінулым годзе злучана кабыл—32 і кароў—51.

Камуна аказвае і дапамогу сялянству; напрыклад, у гэтым годзе пазычана сялянам 1131 пуд бульбы.

Цяга сялянства ў камуну вялікая; сяляне прыходзяць з вёсак і просяць, каб іх прынялі ў камуну. Амаль на кожным пасяджэньні праўленьня разглядаецца 2-3 заявы аб прыёме ў камуну.

Апрача адзіночных заяў аб прыёме ў камуну, **паступаюць і калектыўныя заявы.** Напрыклад, 10 сялян з вёскі Студзёнка падалі заяву, каб іх прынялі ў камуну. Камуна пасылае ў вёску двух камунараў для арганізацыі камуны.

Па ініцыятыве камуны імя К. Лібкнэхта нядаўна арганізавалася камуна ў Гарадку імя Карла Маркса.

РВК надаеў, а рэвізоры—горш.

Камуна можа разьвівацца толькі пры шчырай калектыўнай дапамозе як з боку мясцовых органаў улады, так і акруговых органаў (асабліва акрсельсаюзу).

Што-ж мы бачым? Бачым, што Быхаўскі РВК і Магілеўскі акрсельсаюз мала зварачваюць увагі на працу камуны, а наадварот — перашкаджаюць ёй у працы. РВК робіць непатрэбныя рэвізіі, піша загады. Раймілісцы нядаўна арыштавала 2-х камунараў бяз усялякіх законных падстаў.

У камуне гавораць так: РВК надаеў, а рэвізоры—яшчэ горш. І гэта праўда, камуну рэвізуюць каму толькі ня лень: раён, акрпракуратура, акрсельсаюз, Белсельсаюз. „Рэвізоры» большай часткай цікавяцца лічбамі, а раз лічбы сходзяцца, значыць усё ў парадку. На быт камунараў і гаспадарку «рэвізоры» не зварачваюць увагі.

Агульная кухня камуны.

Палітасьветная праца праводзіцца слаба.

Праца парт'ячэйкі ў камуне праводзіцца слаба, толькі ў апошні час з прысылкай новага сэкратара ячэйкі т. Ермалаева назіраецца ажыўленьне партыйнай працы. Былі такія выпадкі, калі на агульным сходзе ячэйкі гаварылі аб кухні, а пастанову в

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра забясьпечаньне сухім апалам культурна-асьветных устаноў, што знаходзяцца ў сёлах, мястэчках і неакруговых гарадох.

У дадатак да сваёй пастановы за 11 чэрвеня 1928 г. пра парадак выдачы лесу ў 1928-29 г. Эканамічная Нарада пры СНК БССР для забясьпечаньня сухім апалам культурна-асьветных устаноў, што знаходзяцца ў сёлах, мястэчках і неакруговых гарадох, пастанаўляе:

1. Абавязаць акруговыя лясныя камісіі вызначаць паказаным вышэй культурна-асьветным установам падвойную (2-гадовую) норму апалу, калі апал выдаецца новай установе, якая ня мае яшчэ запасу сухіх дроў, ці існуючай установе, дзе апал не загатоўлен на год уперад.

2. Апал выдаваць з самага пачатку высечкі, г. зн. з 1 верасьня і ў поўнай норме, вызначанай для ўстаноў, што знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце.

3. У малалесных раёнах, дзе няма магчымасьці задаволіць культурна-асьветныя ўстановы апалам дровамі, абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты карыстацца торфавым апалам. Колькасьць торфу, што выдаецца, павінна адпавядаць колькасьці дроў, што замяняюцца залежна ад якасьці торфу.

4. Пры складаньні і зацьверджаньні бюджэту адпаведныя выканаўчыя камітэты і фінансавыя органы на мясцох павінны прытрымлівацца рэальнага кошту апалу, грунтуючыся на разьмеры платы ад ня (паводле таксы 1924 г. без гандлёвай набаўкі) кошце загатоўкі і вывазкі.

5. Абавязаць акруговы выканаўчы камітэты нагляданць за выкананьнем гэтай пастановы.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады **В. Крывіцкі.**

22 чэрвеня 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

об обеспечении сухим топливом культурно-просветительных учреждений, находящихся в селах, местечках и неокруговых городах.

В дополнение к постановлению своему от 11 июня 1928 г. о порядке отпуска леса в 1928-29 г., Экономическое Совещание при СНК БССР, в целях обеспечения сухим топливом культурно-просветительных учреждений, находящихся в селах, местечках и неокруговых городах, постановляет:

1. Обязать окружные лесные комиссии установить для вышеуказанных культурно-просветительных учреждений двойную (2-хгодичную) норму отопления в случаях отпуска отопления вновь открытому учреждению, которое не имеет еще запаса сухих дров, или существующему уже учреждению, где отопление заготовлено на год вперед.

2. Отопление отпускать с самого начала высечки, т. е. с 1 сентября, и в полной норме, предоставляемой для учреждений, находящихся на государственном бюджете.

3. В малолесных районах, где нет возможности обеспечить культурно-просветительные учреждения отоплением дровами, обязать районные исполнительные комитеты применить пользование торфяным отоплением. Отпускаемое количество торфа должно полностью соответствовать заменяемому количеству дров зависимо от качества торфу.

4. При составлении и утверждении бюджета надлежащие исполнительные комитеты и финансовые органы на местах должны придерживаться реальной стоимости отопления, исходя из размера поденной платы (по таксе 1924 г. без торговой наддачи), стоимости заготовки и вывозки.

5. Обязать окружные исполнительные комитеты иметь наблюдение за исполнением настоящего постановления.

Председатель Экономического Совещания при СНК БССР **М. Карклин.**

Зам. Управделами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания **В. Кривицкий.**

22 июня, 1928 г. г. Минск.

УВЕСЬ ПРАЦОЎНЫ МЕНСК ДАПАМОЖА Ў БУДАЎНІЦТВЕ ТРАМВАЮ.

(З пленуму Менскага Гарсавету).

На пленуме Менскага Гарсавету ў панядзелак 2-га ліпеня працягваліся спрэчкі па дакладу т. Рабіновіча аб пабудове ў Менску трамваю.

Тав. Баранецкі знаходзіць, што пабудова трамваю мэтазгодна і выказвае думку, што ў вагонах неабходна вешаць прадольныя месцы для сядзеньня, бо тады вагон будзе больш умясьцільным. Разам з тым т. Баранецкі кажа аб тым, што да работ першай чаргі трэба адвесьці таксама пабудову лініі Пярэспа-Серабранка, бо гэты раён густа заселены. Будаваць ня трэба гаспадарчым спосабам—гэта будзе лепш,—заканчвае т. Баранецкі.

Тав. Карпешына адзначае, што праезд на трамваі для рабочых таксама будзе крыху дарагаваты. Неабходна, па думцы т. Карпешынай, у вагоне вешаць папярэчныя лавы для сядзеньня.

Тав. Маршульская ня згодна з папярэднімі таварышамі і гаворыць,—калі ў нас ёсьць аўтабусны рух, дык пабудова трамваю неэтазгодна, а трэба лепш падумаць аб пашырэньні аўтабуснага руху.

Таварышы Ліўшыц, Нахімовіч выказваюцца за мэтазгоднасьць пабудовы трамваю. Тав. Ліўшыц лічыць неабходным скарыстаць пры пабудове трамваю грамадзкія работы. Тав. Нахімовіч гаворыць аб тым, што будаўніцтва трамваю трэба перадаць адразу якой-небудзь адной арганізацыі, а не перадаваць з рук у рукі, як то было з халадзільнікам.

Тав. Рабіновіч у заключным слове адзначыў, што пабудова трамваю будзе спрыяць утаненьню руху. Аўтабусны рух мы будзем пашыраць як міжрайённыя зносіны. Тав. Рабіновіч высьветліў усе закранутыя ў спрэчках пытаньні, пасьля чаго пленум прыняў пастанову, якая ў асноўным зводзіцца да наступнага.

Зацьверджаны напрамак лініі трамваю першай чаргі—вакзал МБВ—Камароўка і Серабранка—Пярэспа. Пленум даручыў прэзыдыуму гарсавету распачаць пракладку шляху МБВ—Камароўка не пазьней ліпеня в тым, каб да прыходу зімы гэты шлях быў скончаны.

У працягу зімы пленум даручыў весьці работу па мантажу электрычнай падстанцыі, падрыхтоўцы вагонаў і інш. абсталяваньня з разрахункам, каб у маі 1929 г. па першай лініі трамваю пашлі вагоны.

Пленум ухваліў пастанову прэзыдыуму гарсавету аб перадачы праэкту на экспэртызу ўсесаюзнага бюро трамвайных зьвязаў. Пытаньне аб шырыні трамвайных вагонаў і аб разьмерах зрэзкі гары на Савецкай вуліцы адкладзена да прадстаўленьня меркаваньняў трамвайным бюро.

Прэзыдыуму гарсавету даручана зрабіць неабходны падлік, якім спосабам весьці будаўніцтва трамваю—гаспадарчым, ці здаць в падраду і канчаткова гэта пытаньне будзе разгледжана на пленуме гарсавету.

Каштоўнасьць пабудовы трамваю першай чаргі арыянтыровачна зацьверджана ў суме 2650000 руб. У гэту суму ня ўключаны тыя выдаткі, з якімі магчыма прыдзецца сустрэнуцца пры пракладцы трамвайных шляхоў (пераноска кабелей, водаправ., магістралі і г. д.).

Фінансаваньне пабудовы трамваю прынята пленумам у наступным відзе: —1100000 руб. доўгатэрміновага крэдыту, 1450000 руб. па дзяржаўнаму і мясцоваму бюджэту і 100000 руб. за кошт грамадзкіх работ. Сёлета будзе адпушчана 436000 руб., у 1928-29г. —1300000 руб. і ў 1929-30 г.—914000 руб.

Прэзыдыуму гарсавету даручана падрыхтаваць пытаньне аб пашырэньні і пераабсталяваньні электрастанцыі. Разам з тым пленум гарсавету прызнаў неабходным арганізаваць камісію па нагляду за пабудовай трамваю, пэрсанальны склад будзе вызначаны прэзыдыумам і зацьверджаны пленумам гарсавету.

У заключэньне пленум гарсавету заклікае ўсё працоўнае насельніцтва Менску падтрымаць ажыцьцяўленьне пабудовы трамваю.

Конкурс на лепшую ячэйку Асоавіяхіму БССР.

Рэдакцыі цэнтральных беларускіх газэт і Чырвонаармейскай Праўды супольна з ЦСаветам Белассавіяхіму арганізоўваюць конкурс на лепшую ячэйку Асо-авіяхіму.

Конкурс прыстасоўваецца да кампаніі «Тыдзень Абароны».

Да актыўнага ўдзелу ў конкурсе заклікаюцца ўсе члены Асо-авіяхіму, рабкоры, селькоры і вайскоры.

Асоавіяхімаўцы Беларусі, узмацняйце абарону Савецкага Саюзу. Пакажэце свае дасягненьні да дню абароны.

Плян конкурсу:

А. Арганізатары конкурсу.

1. Конкурс арганізуюць і праводзяць усе рэдакцыі цэнтральных беларускіх газэт „Красноармейской Правды" супольна з ЦСаветам Асоавіяхіму БССР.

Б. Задачы конкурсу.

1. Вывяць дадатныя і адмоўныя бакі работы ячэек Асо-авіяхіму.

2. Праверыць ступень выкананьня ячэек асноўных задач т-ва ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці і васпізацыі васельніцтва.

3. Сканцэнтраваць агульна-грамадзкую думку навакол Асоавіяхіму і працы ячэек Асоавіяхіму, утварыць спаборніцтвы і падняць зацікаўленасьць у працы і праз гэта дабіцца колькаснага пашырэньня і якаснага палапшэньня працы ячэек Асоавіяхіму.

В. Парадак конкурсу.

1. Конкурс праводзяць рэдакцыі (Менск) газэт: «Зьвязда», „Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Беларуская Вёска», „Чырвоная Зьмена", «Октябрь", «Орка» і «Красноармейская Правда».

Рабкоры, селькоры, вайскоры і члены Асоавіяхіму, рабочыя, сяляне і служачыя пасылайце свае карэспанденцыі на свайму жаданьню ў рэдакцыю адной з памянёных газэт.

2. Матар'ялы, паступаючыя ў тую ці іншую рэдакцыю, друкуюцца ў газэтах, падбіраюцца рэдакцыямі газэт і канцэнтруюцца ў асобай камісіі, арганізуемай пры ЦСавеце Асоавіяхіму.

3. Конкурс праводзіцца з 5 ліпеня на 22 ліпеня.

4. Вынікі конкурсу апублікуюцца 15 жніўня.

Г. Карэспандэнцыя на конкурс.

1. Пісаць допісі аб працы ячэек Асоавіяхіму могуць усе.

2. Аўтар кожнага допісу паведамляе поўнасьцю свой адрас, месца працы, якую працу выконвае, ціastаіць членам АСО-Авіяхіму і які ўдзел прымае ў яго рабоце.

3. Кожны допіс на конкурс, што напісан самімі ячэйкамі ці іх кіраўнікамі павінен быць завераны фабзавмасцкомам, а на вёсцы сельсаветам.

4. Допісы ўсіх іншых аўтараў дасылаюцца без усякае праверкі.

5. Карэспандэнцыі павінны быць напісаны разборчыва, зжата, в фактамі і лічбамі (без агульных разважаньняў) канкретна.

Д. Прэміі.

1. ЦСаветам АСОАвіяхіму БССР вызначаюцца на прэміраваньне лепшых ячэек 10 прэмій на суму 880 р.

2. Ячэйкі разьбіваюцца на 3 групы: першая група гарадзкія, другая—сельскія і трэцяя—вайсковыя.

3. Для кожнай групы ячэек назначаецца па 3 грашовых прэміі. Першая прэмія—150 р., другая—70 р. і трэцяя—50 р. Адна прэмія ў 70 р. на назначана запасной на выпадак выяўленьня лепшай ячэйкі, не падпыюўшай ні ў адну з гэтых груп (транспартная, школьная, санхоская).

Е. Камісія па правядзеньню конкурса.

1. Камісія і «журы» складаецца з т. т. Чэпка (ЦС АСО-Авіяхіма), Антанікоўскага (АПА ЦК КП(б)Б), Кундзіча і Шмідта (прадстаўнікі ад рэдакцый газэт) і т. Кулака (ЦСПСБ).

Камісія па правядзеньні конкурса.

Недахопы таварадастаўкі ці кепскія фінансы?

Сход упаўнаважаных Беларускага Саюзу Каапэрацыйных Аб'яднаньняў, які нядаўна адбыўся, аддаў шмат увагі пытаньням таварадастаўкі і дакумэнта звароту. Спажывецкая сыстэма Беларусі, як ма' быць і іншых рэспублік, нездаволена практыкай таварадастаўкі. «Летам атрымліваем вату і цёплы трыкатаж, а ўзімку—паркалі і ваконнае шкло»,—у адзін голас скардзіліся прыехаўшыя са ўсіх канцоў Беларусі каапэратары. Дакумантаварот і сыстэма разьлікаў зусім немагчымыя. «Рахунак ідзе на валох», як уворна выказаўся адзін з удзельнікаў зьезду.

Бясспрэчна: існуючая практыка таварадастаўкі мае шмат значных дэфэктаў, якія павінны быць зьнішчаны. Аднак, ня ў іх, нам думаецца, цэнтр цяжараў неўпарадкаванасьці таварадастаўкі спажыўцу і пэрманэнтных цяжкасьцяй спажывецкае сыстэмы. І выбарка тавараў на генэральных дагаворах роўнымі долямі ў працягу ўсяго году незалежна ад сэзону, і атрыманьне ў аптовым зьвяне ваты і цёплага трыкатажу летам, а ўзімку паркалю і ваконнага шкла, і цэлы шэраг іншых «дэфэктаў» таварадастаўкі, на наш погляд, не ўяўляюць нічога асаблівага з нункту погляду нармальнае працы тавараправодзячага апарату. Бо неабходнай умовай нармальнае цыркуляцыі тавараў зьяўляецца розьніца ў сэзонах аптовага і розьнічнага зьвеньняў тавараправодзячага каналу. Даваенная гандлёвая практыка вельмі выразна падзяляла гэтыя сэзоны пр межкамі часу ў тры і больш месяцаў.

Мы зусім ня зьбіраемся раўнаць даваенныя ўмовы тавараабароту і сучасныя—іх аддзяляе бяздоньне зьменаў сацыяльнага характару і ўсяе структуры нашае народнае гаспадаркі, у тым ліку і тавараабароту. Паколькі прамысловасьць не працуе і ня можа працаваць непасрэдна на рынак, а зьвязваецца са спажыўцом праз складаную сыстэму тавараправодзячага апарату, настолькі розьніца ў сэзонах аптовага і розьнічнага таргоў ёсьць і павінна быць. Наша-ж каапэрацыйная сыстэма зьверху да нізу за апошнія гады таварнага голаду прызвычаілася працаваць непасрэдна на сёньняшні дзень, без тавараных запасаў, перадаючы тавар з рук у рукі ў парадку разьмеркаваньня. Натуральна таму, што малейшая замінка на рынку кожны раз адгаўляе гутаркі аб прымусовым ці вытворчым асартымэнце, аб дэфэктах таварадастаўкі і г. д. Наступ нашых каапэратараў у гэтых адносінах зрабіўся вельмі верным паказальнікам рыначнае кан'юнктуры па ацэнцы сыстэмы генэральных дагавораў і таварадастаўкі, наогул лягчэй вызначыць іх гандлёвыя справы, агульнае становішча рынку.

Але арган сацыялістычнага разьмеркаваньня, якім па сутнасьці зьяўляецца спажывецкая каапэрацыя, ня можа і не павінен знаходзіцца ў такім нэрвозным становішчы, у такой залежнасьці ад рыначнае стыхіі.

Каапэрацыйная сыстэма робіць добра, калі ставіць пытаньні таварадастаўкі—яны бязумоўна патрабуюць палепшаньня ў значных карэктывах, але кепска, калі пытаньні таварадастаўкі робяцца цэнтральным узлом, тлумачачым ўсё. Калі на таварадастаўкі зазначаюць і ў патрэбных і ў непатрэбных выпадках, заслужана ці незаслужана калі пры гэтым забываюць улічыць уласныя недахопы, уласнае няўменьне працаваць.

На сходзе ўпаўнаважаных падаваліся вельмі яскравыя факты, якія сьведчаць аб кепскім веданьні каапэрацыйнымі арганізацыямі рынку, патрэбаў спажыўца. Заўкі каапэрацыйных арганізацый у значнай меры непрадуманы, не адпавядаюць патрэбам рынку.

Месцы таксама папракалі Белкаапсаюз, бо і там справа стаіць ня лепш. Кепскае веданьне рынку, слабая ўвага да вывучэньня рыначнай кан'юнктуры з боку каапэрацыйных арганізацый зьяўляюцца таксама адной з немалаважных прычын дэфэктаў дастаўкі тавараў.

Але самай значнай прычынай нэрвозасьці нашай каапэрацыйнай сыстэмы, яе скаргаў на неўпарадкаванасьць дастаўкі тавараў, на наш погляд, зьяўляецца фінансавае становішча каапэрацыі.

Для нас ясна, што пры даным фінансавым становішчы каапэрацыйнай сыстэмы ўсякая сыстэма таварадастаўкі будзе мець недахопы. Каапэрацыйны тавараварот, які ўсё больш разьвіваецца і пашыраецца, патрабуе новых сродкаў, вядомага наліча ўласных сродкаў, страхуючых фінансавую ўстойлівасьць ад кан'юнктурных зьмен. Пры недастатковасьці-ж, а ў шмат якіх выпадках і пры поўнай адсутнасьці ўласных сродкаў, пры адносна слабым прыцягненьні сродкаў насельніцтва як у выглядзе паявых узносаў, так і ўкладаў і авансаваньня закупак,—нармальная праца каапэрацыйных арганізацый наўхільна будзе парушацца то з боку няпоўнай дастаўкі тавараў рынку, то з боку фінансавых цяжкасьцяй, дзякуючы зноў-такі законнаму імкненьню забясьпечыць патрэбы спажыўца. Дыспрапорцыя, якая маецца паміж задачамі спажывецкай каапэрацыі і яе фінансавымі магчымасьцямі, няўхільна прыводзіць яе і будзе прыводзіць да супярэчнасьцяй, да дылемы—ці як мага поўная дастаўка спажыўцу, павышэньне якасьці гандлёвых паслугаў, ці фінансавая роўнавага.

Правільны дыягназ—першая і самая асноўная ўмова пасьпяховага лячэньня ўсякай хваробы.

Наш дыягназ—кепскія фінансы. Калі гэта будзе выразна прызнана каапэрацыйнай сыстэмай у цэлым і кожнай арганізацыяй паасобку, дык, бязумоўна, будуць знойдзены і адпаведныя сродкі лячэньня, якія ў вядомай меры крыюцца ўнутры самой каапэрацыйнай сыстэмы.

Л. РАСІН.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Цэнтр. Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР

30-га чэрвеня пад старшынствам тав. Чарвякова адбылося чарговае пасяджэньне прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

На пасяджэньні была заслухана інфармацыя загадчыка Усебеларускай Дзіцячай Камуны тав. Селіванава аб становішчы гэтай камуны.

У прынятай пастанове, прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі адзначаў, што дзякуючы дровным узнемаладносінам, якія ўтварыліся ў гэтым годзе паміж прадаўнікамі камуны, значна запазьнілася складаньне будаўнічых плянаў, а таксама і выкананьне па іх будаўнічых работ, ня гледзячы на тое, што замінкі ў недахове сродкаў і матар'ялаў ня было.

Падкрэсьліваючы, што камуна патрабуе сумленных і адданых гэтай справе прадаўнікоў, Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі лічыць неабходным, у мэтах ліквідацыі хваравітых зьявішчаў, якія зтварыліся ў камуне, перагледзець пэрсанальны склад камуны, скараціць існуючыя штаты, а таксама і прадаўнікоў, якія паказалі сябе з адмоўнага боку.

Прэзыдыум пастанавіў прасіць Магілеўскі Акрыканком правесьці гэтую рэарганізацыю пры ўдзеле загадчыка камуны і палалей мець сталы нагляд за яе жыцьцём.

Таксама запрапанавана выпрацаваць правілы ўнутранага распарадку камуны прыстасаваныя для абслугоўваньня бясспрытальных дзяцей, ажыўіць працу педсавету, дзіцячага калектыву, піянэрскіх і грамадзкіх арганізацый.

Прэзыдыум лічыць неабходным зараз-жа прыступіць да пабудовы школы, адправоду і іншых будаўнічых работ згодна прадстаўленых і зацьверджаных каштарысаў. На пабудову гэтай школы Нар. Кам. Асьветы адпусае 50 проц. яе каштоўнасьці.

У бліжэйшыя часы прэзыдыум лічыць неабходным паслаць у камуну 30 бясспрытальных дзяцей з вёскі.

На гэтым-жа пасяджэньні, прэзыдыум зацьвердзіў плян правядзеньня месячніка дапамогі бясспрытальным дзеням. Апошні будзе праведзен з 15-га жніўня г. г.

У таварыстве культурнай сувязі з замежнамі.

У панядзелак, 2-га ліпеня адбыўся агульны сход таварыства культурнай з замежнамі. На сходзе быў заслухан справаздачны даклад праўленьня таварыства (З. Жылуновіч і А. Цьвікевіч) даклад рэвізійнае камісіі (Л. Барсукова) і даклад Сіманоўскага аб кнігабмене з замежнамі.

З дакладу выясьнілася, што за справаздачны перыяд т-ва прымала ўдзел у прыёме 4-х замежных дэлегацый, у 3-х падарожжах з культурнымі мэтамі яго прадстаўнікоў у Зах. Эўропу, ўдзельнічала ў 2-х замежных выстаўках, зьмясьціла цэлы шэраг інфармацыйных артыкулаў у замежнай прэсе, выдала два зборнікі (на расейскай і нямецкай мове) аб беларускай культуры і г. д.

Сталы кнігабмен БССР арганізаваны праз дзяржаўную бібліятэку больш чым в 20 замежнымі ўнівэрсытэтамі, інстытутамі і кніжнымі палатамі. Пасьля жвавых спрэчак сход прызнаў праробленую т-вам працу вельмі здавальняючай і прызнаў рэзалюцыю ў якой зазначае на патрэбу арганізаваць у бліжэйшай будучыні сталую сувязь з замежнай прэсай, шляхам адпаведных карэспандэнтаў і наладзіць шэраг лекцый аб культурным становішчы бліжэйшых да БССР краін—Літвы, Латвіі і Польшчы.

Пастаноўлена ў бліжэйшым часе выдаць на нямецкай мове другі зборнік аб беларускай культуры, які прысьвяціць агляду працы вышэйшых навуковых і навучальных устаноў Савецкай Беларусі (Інбелкульт, Унівэрсытэт, Акадэмія, Тэхнікумы і г. д.).

Вясковая каапэрацыя пашырае гандаль кніжкамі.

Па сыстэме спажывецкай каапэрацыі ў БССР зараз налічваецца 110 кніжных крам і аддзяленьняў і 135 кніжных паліц пры крамах. Сёлета мяркуецца адчыніць яшчэ 22 крамы, 56 аддзяленьняў і 295 кніжных паліц, дзякуючы чаму ўдасца рынак ахапіць на ўсе 100 проц.

Звароты на продажы літаратуры мяркуецца давесьці да 375000 руб, і на пісчай паперы да 3000000 руб.

Краязнаўчыя матар'ялы.

Гэтымі днямі ў Менскае акруговае т-ва краязнаўства паступіла в Чэрвенскага раённага т-ва краязнаўства шмат матар'ялаў (песьні, казкі, загадкі, прыказкі, загаворы, абрады і інш.). Большасьць матар'ялаў сабрана вучнёўскімі краязнаўчымі гурткамі і настаўнікамі. Паміж матар'ялямі маецца артыкул настаўніка „Равалюцыйны рух на Хутарскому с-савету».

Лётарэя МЦРК для пайшчыкаў.

7-га ліпеня ў Міжвароцны Дзень Каапэрацыі Менскі ЦРК у садзе «Прафінтэрна» для пайшчыкаў, якія ўдесьлі поўнасьцю 15 руб. пай, наладжае бясплатную лётарэю. Будуць разыграны адрэзы сукна, прымусы, дзіцячыя лялькі і іншыя рэчы,—усяго некалькі сотен выігрышаў. Білетаў будзе больш 2000 штук.

Апавяшчэньні.

У суботу, 7-га ліпеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ЦК ЛКСМБ склікаецца нарада атраду «лёгкай кавалерыі» пры газэце „Чырвоная Зьмена" разам з інструктарскай групай ЦКК НК РСІ на пытаньню аб першых кроках працы і далейшых задачах атраду.

Камсамольцы, у якіх будуць сходы ячэек, ад апошніх згодна пастановы сэкратарыяту МенАК ЛКСМБ—вызваляюцца. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

ДА ВЕДАМА НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

Навуковыя прадаўнікі, члены сэкцыі, якім вызначана дапамога на лячэньне, могуць яе атрымаць штодзённа ад 10 да 12 гадзін удзень у канцэлярыі ЦП саюзу працасьветы. Бюро сэкцыі Н. П.

САД АСЬВЕТЫ.

Сёньня кіно-сэанс „Воинственные скворцы". Пачатак а 10 гадз.

Білеты сябрам Дому і курсантам—10 к. Сябрам саюзу—15 к.

У выніку дрэннага надвор'я пераносіцца ў Дом.

Менскі дзень.

7 ліпеня Менскі ЦРК на Ляхаўцы адчыняе новую краму ў спэцыяльна пабудаваным будынку. Пабудова крамы каштавала 30.000 руб.

500.000 руб. ужо адпушчана на пашырэньне малочнай справы ў БССР.

Гэтым сродкі адпусьціў Белсельбанк у выглядзе доўгатэрміновага і кароткатэрміновага крэдытаў.

ВСНГ ужо зрабіў заказы на заграніччнае абсталяваньне для галянтарэйнай фабрыкі на заграніччным рынку.

Досьледы па адшуканьні жалезнай руды ў Гомельскай Магілеўскай і іншых акругах праводзіць горны аддзел ВСНГ.

З 1.033.000 руб. на першае настрычніка 1927 году палны капітал высновай спажывецкай каапэрацыі БССР павялічыўся да 2459.223 руб. на першае чэрвеня 1928 г.

У Аўтадоры.

Выезд у вёску.

Па ініцыятыве ячэйкі Аўтадору, сяляне вёскі Галіца, Астрашынка-Гарадзецкага раёну паставілі паправіць пад'язныя шляхі да вёскі, працягам у 140 мэтраў. У сувязі з гэтым менскае аддзяленьне Аўтадору в прадстаўніком цэнтральнага праўленьня выяжджаюць 8-га ліпеня ў гэтую вёску для кіраўніцтва работамі і правядзеньня агітканпаніі.

Праца ячэек Аўтадору.

Па апошнім пасяджэньні менскага аддзяленьня Аўтадору былі заслуханы даклады аб працы ячэек Аўтадору, якія існуюць на фабрыцы Мешнвою і шклянога заводу «Пралетары».

Ячэйка Аўтадору пры Мешнвою яднае 45 чал., а ячэйка Аўтадору пры шклянym заводзе „Пралетары"—100 чал. Ячэйка заводу «Пралетары» мае 2 гурткі: аўтамабільны і матацыклетны. Работа ячэйкі Мешнвою прызнана слабай.

Менскае праўленьне Аўтадору, заслухаўшы даклады ячэек, запрапанавала ім узмацніць работу і ўцягнуць новых сяброў.

Лік ячэек Аўтадору расьце.

Бабруйскае акруговае аддзяленьне Аўтадору ў сучасны момант яднае каля 25 ячэек з агульным лікам сяброў у іх 605 чал. Ячэйкі арганізаваны пры ўсіх райвыканкомах.

У г. Бабруйску акруговае аддзяленьне Аўтадору арганізавала аўтабусны рух.

Аддзяленьне мяркуе ў бліжэйшы час склікаць усіх вялёсыпедыстаў гораду для арганізацыі гарадзкой вялёсыпэдай каманды.

Таксама мяркуецца арганізаваць вялёсыпэдныя прабегі ў акруговым маштабе.

У працягу гэтага году аддзяленьне мяркуе ўцягнуць у пэрагі Аўтадору 10000 сяброў.

Дасягненьні ў працы МЦРК.

У сваёй дзейнасьці праўленьне ЦРК кіравалася пастановамі сходаў упаўнаважаных і сходамі пайшчыкаў.

Асаблівая ўвага праўленьня ў галіне каапэраваньня было зьвернута на каапэраваньне адстаных прафсаюзаў (савгандслужачых, працасьветы, будаўнікоў, швэйнікаў і тэкстыльшчыкаў), а таксама домахазяек. Адначасова была ўдзелена ўвага каапэраваньню ўтрымаўцаў страхкасы і беспрацоўных.

І вось, якія дасягненьні маюцца ў справе ўцягненьня новых пайшчыкаў. Калі на 1-га чэрвеня 1927 г. было пайшчыкаў—27.750 чал., дык ужо на 1-га чэрвеня г. года налічваецца 34.816 пайшчыкаў (рост на 25,5 проц.). З усёй колькасьці пайшчыкаў, членаў прафсаюзаў каапэравана 78%.

Таксама была праведзена і зараз праводзіцца кампанія сярод пайшчыкаў аб павышэньні паявога ўзносу да 15 руб. На 1-га чэрвеня г. г. паступіла паявога капіталу 232.324 руб. Рост паявога капіталу, у параўнаньні з капіталам на 1-га чэрвеня 1927 г., складае 85,4 проц.

Праца сярод ваенных праходзіла па лініі каапэраваньня і палапшэньня іх абслугоўваньня. Начсклад каапэраваны на 95 проц., чырвонаармейцы—на 85 проц. Амаль пры ўсіх вайсковых часьцях маюцца гандлёвыя пункты МЦРК. Лягеры абслугоўваюцца 2 сталоўкамі і 6 крамамі і ларкамі.

Для вайсковых часьцей выпісваюцца каапэрацыйныя газэты і часопісі. Да дню 10-цігодзьдзя Чырвонай арміі было раздадзена 15 каапэрацыйных бібліятэчак.

Значна ўзрасла гандлёвая сетка МЦРК. Калі на 1-га чэрвеня 1927 г. налічвалася 50 крам, 15 ларкоў, 27 буфэтаў і 8 сталовак, дык ужо на 1-га чэрвеня г. г. маецца 66 крам, 20 ларкоў, 28 буфэтаў і 8 сталовак.

Абслугоўваньне акраін гораду цярабкопам застаецца нездавальняючым, з-за адсутнасьці на акраінах належных памяшканьняў. МЦРК узьнята хадайніцтва перад належнымі арганізацыямі аб водпуску доўгатэрміновых крэдытаў для пабудовы крам і ларкоў на акраінах гораду.

У адносінах снабжэньня пайшчыкаў малочнымі прадуктамі, мясам, рыбай і інш. сельска-гаспарчымі таварамі маюцца таксама дасягненьні. Звароты па малочных прадуктах узраслі ў 2½ разы. Сетка крам, праз каторую адпускаюцца малочныя прадукты, таксама пашырана. Значнае разьвіцьцё атрымала снабжэньне спажыўцоў рыбай. Попыт на рыбу здавальняецца Менцярабкопам прыкладна на 70 проц.

За апошні час пашырылася снабжэньне спажыўцоў гатовым адзеньнем. Зварот за паўгодзьдзе (за час з 1-га кастрычніка 1927 г. па 1-га красавіка 1928 г.) гатовым адзеньнем узрос у 3 з пал. разы.

Для доўгатэрміновага крэдытаваньня пайшчыкаў Мінцярабкоп атрымаў 200.000 руб. Выдана за час з 1 кастрычніка 1927 г. па 1 красавіка г.г. тавараў у крэдыт на суму 676.059 руб., у тым ліку доўгатэрміновага 510.741 рублёў дробналавачнага—130.178 руб.

Адміністрацыйныя выдаткі на ўтрыманьне цэнтральнага апарату скараціліся на 18 проц., у параўнаньні з першым паўгодзьдзем 1926-27 г. Выдаткі на канцэлярскія прыналежнасьці скарочаны на 42 проц., на камандыровачныя і разьезды на 27 проц.

Масавай каапэрацыйнай прапаганды ў бягучым годзе была ўдзелена значная ўвага, было праведзена шмат каапэрацыйных сходаў і вечароў, выдана 34 бібліятэчкі, арганізавана 20 каапэрацыйных бібліятэчак - перасовак. Апроч таго пры МЦРК існавалі курсы для перападрыхтоўкі працаўнікоў прылаўка.

Пры МЦРК існуе дзіцячы вагар, у які прынята 35 дзяцей пайшчыкаў. На летні перыяд арганізавана дзіцячая пляцоўка.

Вось в якім дасягненьнямі прыходзіць МЦРК да сьвята Міжнароднага Дню Каапэрацыі.

Бязумоўна МЦРК мае яшчэ шмат недахопаў у сваёй працы. І толькі пры актыўным удзеле пайшчыкаў, пры большай зацікаўленасьці з іх боку да працы каапэрацыі недахопы будуць зьнішчаны.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

ВІЦЕБСКАГА АКРУГОВАГА ТАВАРЫСТВА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА КРЭДЫТУ

АКТЫЎ на 1 кастрычніка 1927 года. **ПАСЫЎ**

НАЗВА РАХУНКАЎ.	Уступны баляс на 1-X 1926 г.		Заключны баляс на 1-X 1927 г.		НАЗВА РАХУНКАЎ.	Уступны баляс на 1-X 1926 г.		Заключны баляс на 1-X 1927 г.	
Каса і бягучыя рахункі	74417	05	64870	90	Асноўны капітал	212305	89	249822	89
Каштоўнасьці	1875	—	4912	45	Інш. уласныя капіт. і фонды	161272	43	168736	28
Дысконт і спец. б. рах. над вэксалі	185424	36	296675	08	Пазыкі	1035840	28	1671985	32
Мэтавыя пазыкі	1120029	31	1786449	37	Перавучот і перазаклад	1428	45	55511	45
Пратэрміноваяя пазыкі	7950	72	508	35	Уклады і бягучыя рахункі	90016	50	111787	13
Карэспандэнты	—	—	3197	95	Карэспандэнты	3625	73	—	—
Разьліковыя рахункі	1672	21	2586	37	Разьлік. рах. і інш. невытрабаваныя сумы	6803	65	5816	77
Розныя дэбіторы	—	—	2780	60	Розныя крэдыторы	—	—	8592	53
Маемасьць і ўдзел у прадпр.	134115	99	137477	79	Прыбыткі будучых гадоў	20932	38	13523	05
Пратэрм. вэксалі і няпэўныя даўгі	15186	91		—	Нераразьмеркаваны прыбытак бягучага году	21578	01	28732	98
Выдаткі будучых гадоў	13131	77	15049	54					
БАЛЯНС	1553803	32	2314508	40	БАЛЯНС	1553803	32	2314508	40

РАХУНАК

прыбыткаў і выдаткаў за 1926-27 аперацыйны год Віцебскага акруговага таварыства сельск.-гасп. крэдыту.

Назва рахункаў.	СУМА.		Назва рахункаў.	СУМА.	
Бягучыя выдаткі	23311	63	Прэманты атрыманыя	117702	08
Прэманты аплачаныя	55707	89	Камісія атрыманая і інш. прыбыткі	2548	13
Камісія аплач. і інш. выдаткі	1015	09			
Амортызацыя маемасьці	695	—			
Няпэўныя даўгі	10787	57			
Прыбытак	28732	98			
УСЯГО	120250	21	УСЯГО	120250	21

Старшыня праўленьня САКАЛОЎ. Галоўны бухгальтар ГЕОРГІЕЎСКІ.

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71. б. сад «Працэмлес». Мастацкі фільм **„СВАЕ І ЧУЖЫЯ"** Пачатак а 9 гадзіне.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". З аўторка, 3 ліпеня Нямецкі баявік. **„НЕБЯСЬПЕЧНЫ ЎЗРОСТ"** Штодня 3 сэансы. Пачатак 1-га а 7 гадз. 15 хв.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З аўторка 3 лі